

НОВЫЯ НАВЫКІ – ДЛЯ НОВЫХ СПРАЎ

ЧЫРВОНКА

АДЗІН З АНЁЛАЎ НАДЗЕІ

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 СТУДЗЕНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 19 (29133)


**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Іаана КАЗАНА-ВІШНЯВЕЦКІ, пастаянны каардынатар ААН у Беларусі:**

*«Інвестыцыі Беларусі ў адукацыю, ахову здароўя і сацыяльныя паслугі забяспечваюць краіне стабільную пазіцыю сярод краін з высокім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу, у выніку чаго Беларусь займае 50-е месца ў індэксе чалавечага развіцця. У 2019 годзе Беларусь захавала станоўчую дынаміку і ў іншых рэйтынгах, падняўшы свае пазіцыі з пункту гледжання свабоды ў сеціве, росквіту, прадухілення злачыннасці, сацыяльнага прагрэсу».*

# ДЗЕ ДОМ, ТАМ І САД





Фота БелТА.

**Учора ў Драгічыне адкрыўся незвычайны дзіцячы сад — ён убудаваны ў шматпавярховы жылы дом. Падобны аб'ект першы ў Брэсцкай вобласці, таму не дзіва, што на адкрыцці прысутнічаў і кіраўнік рэгіёна Анатоль Ліс. У садку, які змогуць наведваць шэсцьдзесят малых, асобны ўваход, уласны дворык са спартыўнымі і гульнявымі пляцоўкамі. Дзеткам будзе зручна, тым больш што многім літаральна з дому не давядзецца выходзіць, каб трапіць у садок.**

## КОРАТКА

• Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка Указам № 27 упаўнаважыў урад на правядзенне перагавораў з Казахстанам аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве ў галіне паставак нафты і нафтапрадуктаў у Беларусь.

• **Юрысты ФПБ праканcультуюць грамадзян у рэгіёнах па новаўвядзеннях у Працоўны кодэкс.**

• Цэны на звадкаваны газ для камунальна-бытавога спажывання павышаны на 4 %.

• **Інвалідам могуць даць права бясплатнага карыстання аўтамабільнымі паркоўкамі.**



• Колькасць банкаўскіх картак у краіне за год вырасла на 3,4 % — да 15,5 мільёна.

• **БелАЗ адпраўляе ў Індыю першую партыю самазвалаў з васьмі машын.**

• Беларусь з 1 лютага павышае экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты.

• **2020 год пройдзе для БРСМ пад дэвізам #раЗАм.**


ISSN 1990 - 763X

20019>


Камунальныя стасункі

# КАБ НЕ ЖЫЦЬ НА СМЕТНІКУ

**Гадоў дзесяць таму пазнаёмілася з жанчынай, якая падняла непапулярную тэму. Таццяна распавяла, што ёй 40 гадоў, маці-адзіночка, на руках — двое школьнікаў. Спецыяльнасці пэўнай не набыла, але вось знайшла для сябе работу, якая вельмі падабалася. І зарплата прыстойная, і калектыў добры, але дзеці саромяцца, што яна працуе сартавальніцай смецця на біямеханічным сартавальным заводзе.**

**— Дзеці кажуць: ты не лепшая за бамжоў, што жывуць са сметніка, а я раблю тое, што кожны з нас павінен рабіць, але не жадае запэцкацца. Рукамі перабіраю пластык, паперу, шкло, адходы з вашых кухняў. За змену праз такіх, як я сартавальнікаў праходзіць некалькі дзясяткаў тон смецця.**

**Сама не разумеючы, жанчына пачала немудрагеліста разважаць пра бясконцае спажыванне, пра тое, што людзі выкідаюць рэчы і не разумеюць іх каштоўнасці для некага іншага. Яна так апантана расказвала пра карысць паасобнага збору адходаў і перапрацоўкі другаснай сыравіны, што заслухаўся б вопытны эколаг.**

Гісторыя той жанчыны-сартавальніцы ўсплыла ў памяці не так даўно, калі некалькі месяцаў таму гомельскія камунальнікі і экалагі ў адзін голас загаварылі: магутнасцяў біямеханічнага сартавальнага завода, які быў пабудаваны ў 2007 годзе, адзінага для паўмільённага Гомеля і навакольных вёсак, больш не дастаткова. Гарадскі палігон цвёрдых бытавых адходаў перапоўнены. На кардынальнае вырашэнне пытання застаецца менш двух гадоў.

СТАР. 4

Шануй сваё

# ЗІГЗАГІ ЛЁСУ СЯДЗІБЫ ХРАПТОВІЧАЎ



Фота БелТА.

## Ці верне «Вяртанне» былую славу Шчорсам?

**Некалі бібліятэка, якую заснаваў у сваім палацы ў Шчорсах пад Навагрудкам апошні канцлер Вялікага Княства Літоўскага Іахім Літавор-Храптовіч, лічылася адным з найбуйнейшых кніжных збораў на тэрыторыі Беларусі XVIII—XIX стагоддзяў. Па розных звестках, яна налічвала ад 10 да больш чым 20 тысяч асобнікаў кніг, рукапісаў, геаграфічных картаў і ўнікальных гістарычных дакументаў. Тут працавалі Адам Міцкевіч, які менавіта ў Шчорсах пісаў сваю «Гражыну», Ігнат Даніловіч і Уладзіслаў Сыракомля, тут у 1846-м шчыраваў на пасадзе бібліятэкара Ян Чачот, падтрымліваючы асаблівую інтэлектуальную атмасферу...**

СТАР. 13

Блізка да сэрца

# ГУМАНІТАРНАЯ ДАПАМОГА ДЛЯ КІТАЯ

**Новы каранавірус, які быў выяўлены ў кітайскім горадзе Ухань у канцы мінулага года, працягвае распаўсюджвацца па свеце і забіраць чалавечыя жыцці. Па звестках на сераду, яго «падчапілі» больш за 6,1 тысячы чалавек у 16 краінах свету. Пераважная большасць з іх — у Кітаі, дзе колькасць заражаных пераваліла за 6 тысяч. 132 чалавекі памерлі.**

*Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў пасланне Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіну. «Дарагі сябар, трывожныя весткі аб распаўсюджанні ў Кітаі каранавіруса нікога не пакінулі абыякавым у Беларусі. Ад імя беларускага народа і ад сябе асабіста выказваю глыбокія спачуванні сем'ям тых, хто памёр, жадаю хутчэйшага выздараўлення ўсім, хто захварэў. Мы захапляемся мужнасцю кітайскага народа і высокай эфектыўнасцю дзеянняў кіраўніцтва КНР у барацьбе з гэтым новым, невядомым раней небяспечным захворваннем», — сказана ў пасланні.*

*Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з пачуццём салідарнасці і сяброўскай падтрымкі беларускі бок прыняў рашэнне накіраваць у Кітай гуманітарны груз са сродкамі індывідуальнай абароны і запатрабаванымі сёння медыкаментамі. «Няхай гэтая дапамога, якая ідзе ад чыстага сэрца ўсіх беларусаў, дазволіць дружалюбнаму кітайскаму народу справіцца з выпрабаваннямі, якія выпалі на яго долю. Мы гатовыя і далей вас падтрымліваць у пераадоленні гэтых часовых цяжкасцей. Толькі скажы, што яшчэ мы маглі б зрабіць для вас. Беларусь заўсёды будзе надзейным і адданым сябрам Вялікага Кітая!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.*


Фота БелТА.

Па даручэнні Прэзідэнта наша краіна акажа гуманітарную дапамогу КНР. Увечары 28 студзеня на аэрадроме ў Мачулішчах пачалася загрузка ваенна-транспартнага самалёта Іл-76 Міністэрства абароны. Ратаўнікі і курсанты Універсітэта грамадзянскай абароны камплектавалі каштоўны груз. У яго склад уваходзяць тавары медыцынскага прызначэння. Гэта лекавыя прэпараты, сродкі індывідуальнай абароны (маскі, халаты і пальчаткі), сродкі дэзінфекцыі, іншыя вырабы медыцынскага прызначэння. Фарміраванне, дастаўку, суправаджэнне і перадачу грузу забяспечаць супрацоўнікі МНС. Як паведаміў першы намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Аляксандр Худалееў, груз дастаўлены ў Пекін.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Парламенцкі дзённік

**Законапраект «Аб абароне персанальных даных» у вясеннюю сесію разгледзяць у другім чытанні**

# ПА САКРЭЦЕ ПА ЎСІМ СВЕЦЕ?

**Абсалютна новы для нашай краіны законапраект прыняты Палатай прадстаўнікоў у першым чытанні ў аўтарскай рэдакцыі ў чэрвені 2019 года. За аснову дакумента, які ўключае пяць раздзелаў, узята «Канвенцыя аб абароне прыватных асоб у адносінах аўтаматызаванай апрацоўкі даных асабістага характару» Савета Еўропы. Распрацавалі закон Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў (НЦЗПД), Міністэрства ўнутраных спраў і Аператыўна-аналітычны цэнтр пры Прэзідэнце. Законапраект накіраваны на ўстанаўленне разумнага балансу паміж абаронай прыватнага жыцця і магчымасцю развіцця тэхналогій і сэрвісаў, якія заснаваны на выкарыстанні асабістай інфармацыі.**

Днямі Пастаянная камісія па нацыянальнай бяспецы, якая рыхтуе дакумент да будучай сесіі, правяла пасяджэнне рабочай групы. Свае заўвагі і прапановы адносна зместу законапраекта накіравалі Камітэт дзяржаўнага кантролю, Нацыянальны банк, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства культуры, Саюз кампаній па рэінжынірынгу рыэлтарскай дзейнасці і кампанія «Твая сталіца».

Абарона персанальных даных — сфера, важная для кожнага беларуса. Чаму — журналістам тлумачыў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Ігар МАРТЫНАЎ**. Прыклад з жыцця: атрымліваючы ў краме картку зніжак, мы пакідаем на апрацоўку інфармацыю аб сабе. «Таму і ўзнікла неабходнасць разгледзець і прыняць гэты законапраект, каб абараніць нашых грамадзян, каб іх персанальныя даныя не былі прадстаўлены ці перададзены трэцяму боку, — расказаў Ігар Мартынаў. — Аператар, які будзе збіраць персанальныя даныя, абавязаны адказваць за іх абарону. І несці за гэта адказнасць».

Форма адказнасці за супрацьпраўныя дзеянні пазней будзе змешчана ў разнастайных кодэксах. Будучы закон датычыцца ўсіх сфер дзейнасці і структур уласнасці — і дзяржаўных, і прыватных. У дакуменце ўстаноўлены пералік органаў, якім персанальныя даныя могуць быць адкрыты без дазволу асобы. Сярод іх следчыя органы і пракуратура.

Заўвагі, прапанаваныя зацікаўленымі бакамі, у асноўным мелі тэхнічны характар і не датычыліся канцэптуальных змен.

«Мы пракладаем шлях, таму прадугледзець усе нюансы, якія могуць быць цяпер і з'явяцца ў далейшым, не можам. Калі прымем закон і ён пачне дзейнічаць, тады зразумеем, што дзе трэба дапрацаваць, што змяніць. Так адбываецца заўсёды», — падкрэсліў дэпутат.

Буйным органам, які збірае і перапрацоўвае персанальныя даныя, з'яўляецца Міністэрства ўнутраных спраў. Яго прадстаўнікі на пасяджэнні рабочай групы падкрэслілі важнасць будучага закона.

«Для грамадства і дзяржавы павінны быць празрыстыя правілы. Трэба стварыць комплекс мерапрыемстваў па абароне персанальных даных, каб грамадзянін пры пэўных, прадугледжаных законам абставінах мог атрымаць доступ да сваіх персанальных даных і пацікавіцца, калі і пры якіх сітуацыях гэтыя даныя абарочваліся, ці патрабаваць у аператара, каб яны былі абязлічаны і знішчаны», — выказаў сваё стаўленне **Аляксей БЯГУН, начальнік дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС.**

Пералік сітуацый, калі даныя прызнаюцца абязлічанымі (іншымі словамі, на іх аснове нельга ідэнтыфікаваць пэўную асобу), таксама прадугледжаны законам. Сярод іх, напрыклад, інфармацыя па перапісе насельніцтва, статыстычныя даследаванні.

Сярод заўваг, якія абмяркоўвала рабочая група, была прапанова выключыць са спецыяльных персанальных даных інфармацыю пра рэлігійныя перакананні асоб, даць магчымасць рыэлтарскім установам звяртацца па інфармацыю пра ўладальнікаў нерухомасці.

Нацыянальны банк прапанаваў пашырыць тэрмін захавання наймальнікам даных пра работнікаў.

Прынцыповы момант, на які звярнуў увагу Камітэт дзяржаўнага кантролю ў сваіх заўвагах да дакумента, звязаны з неабходным заснаваннем незалежнага органа па абароне персанальных даных. Разглядаліся варыянты, што такую работу могуць на сябе ўзяць пракуратура ці МУС. Але, згодна з Канвенцыяй, на якой асноўваліся распрацоўшчыкі і членамі якой яны жадаюць стаць, такі орган не павінен мець поліфункцыяналу. Да таго ж у гэтым выпадку праваахоўныя органы апынуцца паміж молатам і кавадлам — неабходнасцю захаваць персанальныя даныя і жаданнем пашырыць іх выкарыстанне для рэалізацыі сваіх непасрэдных функцый.

Распрацоўшчыкі новага закона падкрэсліваюць, што для яго эфектыўнай дзейнасці неабходна мяняць стаўленне людзей да персанальнай інфармацыі і навучыцца адказна працаваць з такімі данымі.

«Справа ў тым, што канстытуцыйнае права на абарону персанальных даных невыпадкова з'яўляецца фундаментам для рэалізацыі іншых правоў. Калі мы не забяспечваем права на абарону персанальных даных, астатнія правы заўсёды знаходзяцца пад пагрозай. Таму ў гэтай сферы павінна быць празрыстасць», — акцэнтаваў увагу прадстаўнік распрацоўшчыкаў **Мікалай САВАНОВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення канстытуцыйнага і міжнароднага права — начальнік аддзела канстытуцыйнага права НЦЗПД.**

**Марыя ДАДАЛКА.**

## СУР'ЁЗНАЯ КІРАЎНІЦКАЯ ШКОЛА

**Ігар Сергеенка ўчора ўзяў удзел у V пленуме Цэнтральнага камітэта БРСМ.**

«БРСМ — гэта сур'ёзная кіраўніцкая школа. Вы не толькі ўзначальваеце абласныя, гарадскія, раённыя арганізацыі Саюза моладзі, але і ўжо з'яўляецеся рэзервам для органаў выканаўчай улады, іншых структур. У гэтай сувязі БРСМ неабходна ўдзяляць больш сур'ёзную ўвагу падрыхтоўцы і навучанню кадраў. У шэрагах арганізацыі павінна быць сапраўды найбольш актыўная і перадавая частка нашай моладзі», — перадае словы кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта БелТА.

Як адзначыў Ігар Сергеенка, з часоў заснавання Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі дзяржава і Прэзідэнт падтрымлівалі ініцыятывы аб'яднання. Вельмі важна, каб арганізацыя працягвала эфектыўна працаваць і сваімі справамі апраўдвала высокі давер. Па яго словах, сёння асаблівую ўвагу БРСМ трэба ўдзяліць рабочай моладзі на прадпрыемствах і ў сельскай мясцовасці.

Ігар Сергеенка падкрэсліў, што БРСМ — пераемнік камсамола Беларусі і ўсё пазітыўнае, што было ў апошнім, трэба працягваць браць на ўзбраенне.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Палесціна адмовілася ад «здзелкі стагоддзя»

«Здзелка стагоддзя», прапанаваная Трампам кіраўніцтву Ізраіля і Палесціны, выклікала абурэнне ўлад дзяржаўнай аўтаноміі і яе насельніцтва. Белы дом прапанаваў зрабіць «непадзельны» Іерусалім сталіцай Ізраіля, а «Усходні Іерусалім» — сталіцай Палесціны. Афіцыйны Тэль-Авіў ініцыятыву падтрымаў, палесцінскі лідар Махмуд Абас яе катэгарычна адхіліў. Палесцінцы палічылі, што ў плане мірнага ўрэгулявання на Блізкім Усходзе ўсе прэферэнцыі аддадзены Ізраілю. Дональд Трамп жа мяркуе, што палажэнні «здзелкі стагоддзя» ставяць абодва бакі канфлікту ў роўнае становішча, і заклікаў усіх з яго ідэямі пагадзіцца.

### У Чылі аб'явілі рэжым бедства

Прэзідэнт Чылі Себасцьян Піньера аб'явіў рэжым бедства ў шэрагу гарадоў на поўначы краіны з-за паводак. Пра гэта кіраўнік дзяржавы заявіў падчас прэс-канферэнцыі, паведамляе мясцовы тэлеканал 24 Oras. «Мы аб'яўляем рэжым бедства ў пяці гарадах», — удакладніў Піньера.



Такое рашэнне дасць мясцовым уладам больш паўнамоцтваў і рэсурсаў для аказання дапамогі пацярпелым і прыняцця мер на выпадак новых паводак на поўначы Чылі. Моцныя лівні абрынуліся на тэрыторыю Чылі ў пачатку тыдня і прывялі да паводак і апоўзняў. Між тым у Бразіліі колькасць загінулых ад паводак ужо перавысіла 60 чалавек.

### Аятала завёў рускамоўны акаўнт

У профілі вярхоўнага лідара Ірана Алі Хаменеі адзначаецца, што на рускамоўнай старонцы будуць публікавацца «навіны, пасланні і выступленні лідара Ісламскай рэвалюцыі». Там жа змешчана спасылка на сайт Хаменеі, дзе ўсе матэрыялы прадстаўлены на рускай мове. Як вядома, у студзені гэтага года Twitter часова заблакаваў афіцыйны акаўнт вярхоўнага лідара Ірана, у якім ён публікаваў інфармацыю на англійскай мове. Зрэшты, акрамя англамоўнага Twitter-акаўнта, у Хаменеі таксама ёсць старонкі на фарсі, французскай і арабскай мовах.

Блізкая ўлада

## Патрэбны дзіцячы кардыёлаг

**Прамую тэлефонную лінію і прыём грамадзян у Лунінецкім раёне правёў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Анатоль МАРКЕВІЧ. Пытанні ўздымаліся самыя розныя: ад праблем ЖКГ і выдзялення зямлі пад сельгасвытворчасць да работы ўстаноў медыцыны.**

На прамую лінію да Памочніка прэзідэнта дазванілася сем чалавек, пры гэтым адзін званок паступіў з Драгічынскага раёна. Тамтэйшы заяўнік прасіў паспрыяць пашырэнню яго фермерскай гаспадаркі. Такі ж па змесце зварот быў і на асабістым прыёме, калі жыхар адной з вёсак выказаў жаданне развіваць сваю асабістую падсобную гаспадарку, і 72 соткі, якія ён мае на цяперашні час, аказаліся недастатковыя.

Жыхарка раёна ўзняла актуальную для многіх праблему: няма дзіцячага кардыёлага. Дзіця заяўніцы пасля аперацыі мае патрэбу ў пастаянных кансультацыях такога спецыяліста, таму сям'я вымушаная ехаць на прыём у іншыя гарады.

Усяго ж на асабістым прыёме разгледжана шэсць зваротаў, адзін з іх калектыўны. Апошні датычыўся дзейнасці гаражнага кааператыва. Заяўнікам парэкамендавалі ўнесці змены ў яго статут, тады спрэчныя пытанні было б лягчэй вырашыць. Жыхары вёскі Цна прасілі паспрыяць падвядзенню газу ў іх населены пункт. Гэтае пытанне патрабуе асобнага вывучэння для далейшага прыняцця рашэння.

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян Лунінецкага райвыканкама Наталля ВАНЮК**, па выніках разгляду зваротаў былі дадзеныя даручэнні адказным асобам выканкама, а ў некаторых выпадках грамадзяне атрымалі кансультацыю.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Alma-mater

## ЮНЫЯ, РАЗУМНЫЯ, АМБІЦЫЙНЫЯ,

### або Месца, дзе выхоўваюць інтэлектуальную эліту

**Ліцэй БДУ — найлепшае месца для юных амбіцыйных людзей. Менавіта так пазіцыянуе сябе ўнікальная ўстанова адукацыі са шматгадовымі традыцыямі ліцэйскага жыцця, якая гэтымі днямі адзначае сваё 30-годдзе.**

Ліцэй БДУ быў створаны ў 1989 годзе, а першыя заняткі прайшлі ў яго сценах у студзені 1990-га. Сёння ліцэй з'яўляецца эксперыментальнай пляцоўкай па апрабацыі і ўкараненні новых праграм і навучальных планаў, кірункаў профільнай адукацыі на старшай ступені сярэдняй школы, інфармацыйных тэхналогій і інавацыйных метадаў навучання.

За ўвесь час дзейнасці Ліцэя тут было падрыхтавана 220 пераможцаў міжнародных алімпіяд і 1690 прызёраў заключнага этапу рэспубліканскіх алімпіяд. Больш за 40 % медалёў, заваяваных беларускімі школьнікамі на міжнародных прадметных алімпіядах, належаць ліцэістам. Па статыстыцы Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў, кожны дзясяты 100-бальны вынік на цэнтралізаваным тэсціраванні атрымліваюць выпускнікі Ліцэя БДУ.

Да юбілею тут падрыхтавалі шэраг мерапрыемстваў. 30 студзеня адбудзецца ўрачыстая частка з узнагароджаннем педагогаў граматамі ўніверсітэта і профільнага міністэрства, а таксама святочны канцэрт з тэатральнай пастаноўкай па матывах твора Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім». У якасці акцёраў выступяць ліцэісты і іх настаўнікі.




Навуковы блок юбілейных мерапрыемстваў будзе прадстаўлены канферэнцыяй «Першы крок у навуку». Форум пройдзе 31 студзеня. Сёлета яго ўдзельнікамі стане больш за 110 навучэнцаў сталічных устаноў адукацыі. Школьнікі выступяць з дакладамі ў 11 секцыях: «Беларуская мова і літаратура», «Руская мова і літаратура», «Замежная мова», «Гісторыя», «Грамадазнаўства», «Матэматыка», «Інфарматыка», «Фізіка і астраномія», «Біялогія і геаграфія», «Хімія», « Фізічная культура». Акрамя таго, у гэты дзень адбудзецца вечар сустрэчы выпускнікоў.

Завершыцца юбілейная праграма 1 лютага спартыўным святам. За першае месца ў эстафетных гонках будуць змагацца зборныя навучэнцаў дзясятых і адзінаццатых класаў, выкладчыкаў і выпускнікоў Ліцэя. Таксама адбудуцца таварыскі матч па валейболе і ўзнагароджанне найлепшых спартсменаў-ліцэістаў па выніках 2019 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

На слыху

# «МЕДЫКІ ПРЫЕХАЛІ Ў СПЕЦКАСЦЮМАХ»

## У дальнабойшчыка, які вярнуўся з Кітая, каранавірус не пацвердзіўся

**Тым часам у пасёлку Прывольным пад Мінскам пазаўчора быў шпіталізаваны дальнабойшчык адной з лагістычных кампаній з падазрэннем на каранавірус. Кіроўца нядаўна вярнуўся з Кітая, ён быў у Маньчжурыі — гэта паўночны ўсход КНР, частка краіны, якая прылягае да расійска-кітайскай граніцы. У яго паднялася тэмпература, і калегі выклікалі хуткую дапамогу. Медыкі прыехалі ў спецкасцюмах, а пацыента змясцілі ў спецыяльны ізаляцыйны бокс, у якім і перавозілі.**

— 11 студзеня мужчына выехаў з Маньчжурыі, далей ехаў толькі па тэрыторыі Расіі. Два дні таму ў яго паднялася тэмпература да 37,1 градуса і пагоршылася самаадчуванне. Ён быў шпіталізаваны. Зараз тэмпература ў норме, пацыент знаходзіцца ў спецыяльным боксе ў бальніцы. Каранавірус у яго не пацвердзіўся, — паведаміла **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.**

Як заявіў **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК**, у Беларусі пакуль выпадкаў заражэння каранавірусам няма. Пры гэтым у краіне праводзяцца ўсе магчымыя супрацьвірусныя мерапрыемствы. У прыватнасці, меры перасцярогі ўзмоцнены ў аэрапорце Мінск.

Міністэрства адукацыі Беларусі ў сваю чаргу рэкамендавала ВНУ, дзе навучаюцца студэнты з Кітая, падоўжыць зімнія канікулы на два тыдні. Але гэта датычыцца толькі тых, хто паехаў на канікулы на радзіму. Студэнты, якія засталіся на гэты час у Беларусі, пачнуць заняткі ў новым семестры па звычайным графіку — з 10 лютага.

Каля паўтысячы кітайцаў працуе ў індустрыяльным парку «Вялікі камень». Пераважная іх большасць — будаўнікі. Каля 400 з іх з'ехалі на навагодні канікулы ў Кітай. Пасля 10 лютага плануецца іх вяртанне ў Беларусь. Як паведамілі ў індустрыяльным парку, у сувязі з успышкай каранавіруса некаторым супрацоўнікам падоўжаць адпачынак, і яны прыедуць у Беларусь пазней. Тыя, хто вернецца, два тыдні не будуць выходзіць са сваіх пакояў — гэта час інкубацыйнага перыяду каранавіруса.

Нягледзячы на меры перасцярогі, інфекцыя выйшла за межы Кітая. Захворванні зафіксаваны ў Тайландзе (14), Тайвані і Ганконгу (па 8), Сінгапуры, Макаа і Японіі (па 7), у ЗША і Аўстраліі (па 5), Францыі, Германіі, Малайзіі і Паўднёвай Карэі (па 4), В'етнаме і Канадзе (па 2), Камбоджы, Непале і Шры-Ланцы (па 1). Аб увядзенні жорсткіх мер аб'явіў Ганконг: там будуць закрыты чатыры пагранічныя пункты на зямлі, два — на вадзе, адменена паромная пераправа і спынены чыгуначныя зносіны з астатнімі раёнамі Кітая. У Тыбеце ўлады заявілі аб закрыцці ўсіх славутых месцаў і ўвядзенні двухтыднёвага каранціну ў дачыненні да ўсіх прыезджых.

Кітайскія ўрачы ўпэўнены, што свайго піку вірус дасягне цягам бліжэйшых дзесяці дзён, пасля чаго сітуацыя стабілізуецца. З імі не згодныя вучоныя з універсітэта Ганконга, якія мяркуюць, што колькасць хворых у найбуйнейшых гарадах Кітая дасягне максімуму ў красавіку—маі.

**Алена КРАВЕЦ.**

З нагоды

# «БЕЛАРУСЬ. BELARUS» — 90 ГАДОЎ!

**Юбілей выдання рэдакцыйны калектыў часопіса і госці адзначылі ў фармаце круглага стала. Ад імя міністра інфармацыі Аляксандра КАРЛЮКЕВІЧА дырэктар і галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ уручыў узнагароды супрацоўнікам рэдакцыі за добрасумленную журналісцкую працу.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

**Саветнік Пасольства Узбекістана ў Рэспубліцы Беларусь Даніяр АБІДАЎ** расказаў, што супрацоўніцтва часопіса з яго краінай ідзе безупынна, на старонках «Беларусь. Belarus» актыўна асвятляюцца падзеі культуры, узаемавыгадныя адносіны паміж абедзвюма дзяржавамі. Павіншаваў з юбілеем гучнымі песнямі і гарэзлівымі танцамі заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь, фальклорны ансамбль «Дударыкі» пад кіраўніцтвам **заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Дзмітрыя РОВЕНСКАГА**, яго ўдзельнікі падзякавалі рэдакцыйнаму калектыву за тое, што часопіс далучае шматлікую чытацкую аўдыторыю да беларускай мовы.

— Мы пішам пра сучасную, інтэлектуальную, прыгожую, з высокім узроўнем культуры Беларусь. Пра людзей, якія валодаюць велізарным патэнцыялам добразычлівасці і таленавітасці, — падзялілася **адказны сакратар выдання Валянціна ЖДАНОВІЧ.** — У тым, што «Беларусь. Belarus» — часопіс іміджавы, сумнявацца не выпадае. Ён выходзіць для замежнай аўдыторыі, а таксама арыентаваны на тых, хто адчувае моцную сувязь з Радзімай, не жывучы ў ёй.

**Галоўны рэдактар «Беларусь. Belarus» Віктар ХАРКОЎ** нагадаў, што ў свой час у часопісе друкаваліся Якуб Колас, Янка Брыль, Максім Танк, Іван Мележ, а першым рэдактарам быў Міхась Чарот. «Як раней рэдакцыя выконвала свае задачы, так і сёння мы імкнёмся сваім невялікім калектывам ствараць цікавае выданне».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

## ФІЛЬМ ПРА НАШУ ДЗІКУЮ ПРЫРОДУ

### Зняць яго для свайго дзяржаўнага тэлебачання плануюць французы

**Французская кампанія Nomades сумесна з універсітэтам Латарынгіі плануе зняць дакументальны фільм аб дзікай прыродзе Беларусі. Пад прыцэлам камер апынуцца прыродаахоўныя комплексы і іх насельнікі — воўк, рысь і мядзведзь. Мэта стужкі — даць уяўленне пра ўмовы суседства людзей з драпежнікамі. Дакументальную карціну плануюць паказаць па дзяржаўным тэлебачанні Францыі, паведамілі ў Міністэрстве лясной гаспадаркі.**

«Французы ў асноўным з боязю ставяцца да гэтых драпежнікаў: яны ўпэўненыя, што іх сумеснае існаванне з людзьмі практычна немагчыма. На прыкладзе Беларусі мы хочам паказаць, што гэта не зусім так і што драпежнікі не аказваюць істотнага негатыўнага ўплыву на чалавека», — цытуе прэс-служба міністэрства словы на сустрэчы з кіраўніцтвам Мінлясгаса аднаго з аўтараў праекта Алена Крэцьена.

У выпадку згоды беларускага боку здымкі плануюць правесці на тэрыторыі рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Налібоцкі» і Бярэзінскага біясфернага запаведніка. Па словах прадстаўніка кампаніі Nomades, яны адрозніваюцца ад існуючых прыродаахоўных комплексаў Францыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## НАРКАТЫЧНЫ АЙСБЕРГ

**Як адзначыла старшыня праўлення грамадскага аб'яднання «Пазітыўны рух» Ірына СТАТКЕВІЧ, летась у 22 прафілактычныя пункты руху звярнулася больш за 41 тысячу чалавек, якія спажываюць наркотыкі.**

Пры гэтым у 2018 годзе на ўліку ў медыцынскіх установах з сіндромам наркатычнай залежнасці стаяла каля сямі з паловай тысяч чалавек, а з прычыны спажывання са шкоднымі наступствамі — крыху менш за пяць тысяч.

Пры гэтым за апошнія пяць гадоў змяніўся і партрэт наркаспажыўца.

— Калі раней нашы кліенты спажывалі адно-два наркатычныя рэчывы, то цяпер іх колькасць складае ад трох да пяці, — кажа Ірына Статкевіч. — Гэта людзі ўжо іншага складу, з іншымі звычкамі спажывання. І ад нас таксама патрабуюцца новыя метады і формы работы з імі.

А вось пытанне дэкрыміналізацыі нарказлачынстваў у Беларусі пакуль не разглядаецца. Пра гэта заявіў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС Андрэй Саладоўнікаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Самі з ВУСАмі: нататкі наваспечаных вяскоўцаў

# ДОБРЫ ЗНАК,

## або Чаму нам тут лёгка дыхаецца


Цяпер родная газета на роднай мове прыходзіць і ў Малую Вусу. Прычым, што ўсцешыла, не адна...

**Цяпер родная газета на роднай мове прыходзіць і ў нашу вуслянскую хату. Вядома, можна было сэканоміць грошы ды працягваць чытаць «Звязду» ў інтэрнэце. Але, як казала мая бабуля: «Ну як гэта жыць у вёсцы ды нічога не выпісваць».**

За апошніх 15 гадоў, што пражыла ў Мінску, мне ні разу нават думка не прыйшла падпісацца на нейкую газету ці часопіс. А вось з пераездам у Малую Вусу накаціла настальгія па вясковым дзяцінстве. Згадала, як пасля школы з нецярпеннем чакала паштальёнку, што прыносіла мне «Раніцу». Часам цёця Лена хітра ўсміхалася і казала: «Ну што, танцуй», — пасля чаго працягвала мне ліст ад сяброўкі па перапісцы (іх я заводзіла менавіта дзякуючы газеце). У такія моманты радасці маёй не было межаў!

Раней у вуслян таксама была свая «цёця Лена», з якой можна было пагаварыць ды пасмяяцца за жыццё. Цяпер жа газеты ў Вусу прывозіць машына «Белпошты». І калі раней каля кожнай хаты вісела свая паштовая скрыня, дык цяпер па свежую прэсу трэба ісці ў цэнтр вёскі. Менавіта там, на плоце, побач з буслянкай вісіць агульная скрыня з пранумараванымі ячэйкамі. Дык вось пасля Новага года і нашай сям'і выдзелілі адну, самую верхнюю. І ключык ад яе далі. Так з'явілася ў нас з Сымонкам новая традыцыя: пяць разоў на тыдзень разам ходзім па «Звязду». Ужо дома сынок з цікаўнасцю гартае газету, тыцкаючы ў фотаздымкі маленькім пальчыкам — «дзядзя», «цёця», «гого» «дуда»... Вось зараз думаю, які б беларускамоўны часопіс выпісаць свайму гадавасіку.

Дарэчы, я была перакананая, што адна з вуслян буду выпісваць «Звязду». І прыемна здзівілася, калі памылілася са сваімі прагнозамі. На днях дастала газету са скрыні, стаю гартаю. Якраз у гэты момант спадар Іван вяртаецца дадому з бензапілой у руках. Павітаўся ды кажа: «А я таксама «Звязду» выпісваю». Аказваецца, яго цесць усё жыццё быў верны нашай газеце. «Не прызнаваў ніякіх іншых выданняў, акрамя «Звязды». А я перад Новым годам ляжаў у бальніцы, дык і куплю ў шапіку то адну газету, то другую. Прыглядаўся. У выніку папрасіў жонку выпісаць «Звязду» на паўгода».

Нядаўна злавіла сябе на думцы, што тут, у Вусе, мы з сям'ёй пачуваемся дома. Глядзіце самі: у Мінску, каб пачуць роднае слоўца, трэба адмыслова наведваць беларускамоўныя імпрэзы. Тут жа, у вёсцы, дастаткова проста выйсці з хаты. Во карэнныя вусляне размаўляюць на сакавітай роднай мове. А з вясны да позняй восені штодзень слых радуюць радыё «Сталіца» ды канал «Культура» Беларускага радыё, што цэлы дзень вяшчае ў альтанцы нашых самых блізкіх суседзяў. Нават аб'явы аб вясковых сходах тут пішуць па-беларуску. Таму нядзіўна, што за больш як паўгода, якія мы тут жывём, ніхто ні разу не запытаўся, чаму мы размаўляем па-беларуску. Тут не трэба баяцца, што цябе не зразумеюць, кажучы такія слоўцы, як чабор, суніцы, ажыны, гарбата, зёлкі, скрыпень... І калі ты папросіш у мясцовай краме цукар ці запалкі, імгненна атрымаеш менавіта тое, што прасіў. Відаць, менавіта таму з першага дня нам тут так лёгка дыхаецца.

У той дзень, калі мы прыехалі ў Малую Вусу глядзець участак, былы яго гаспадар першым чынам пазнаёміў нас з будучымі суседзямі. Памятаю, як пераглянуліся з мужам, калі Галіна Фёдараўна загаварыла з намі па-беларуску. Аказалася, яна да пенсіі працавала настаўніцай. У свой час нават пісала артыкулы ў «Настаўніцкую газету» пра важны ўплыў роднай мовы на выхаванне дзетак. Я тады адразу свайму Уладзю сказала, што гэта лёс, добры знак.

Перад Новым годам, калі ездзілі выпісваць «Звязду» ў Ліцвяны (паштовае аддзяленне месціцца ў суседняй вёсачцы), дык зайшлі ў дзіцячы садок, куды плануем пазней аддаваць свайго Сымонку. Мала таго, што маладая выхавацелька дазволіла малому пагуляць з цацкамі, дык і, што ўсцешыла, звярталася да яго на роднай мове.

Дачка ж майго ўніверсітэцкага сябра ходзіць у гарадскі садок. Дык вось пасля Каляд вярнулася Васіліса дадому і дзеліцца ўражаннямі: «Папа, сегодня к нам в группу приходили ряженные щедровщики, пели песни, а потом воспитатель сказала: «Бярэм казу ў кола!». Кола — это как? Как в песне «виски, кола, королева танцпола»?» Як кажуць, і смех і грэх... Гэтая гісторыя ўжо каторы дзень не выходзіць у мяне з галавы. А дакладней, каментары бацькоў, якія пасыпаліся пад Алесевым пастом у сацсетках. Маўляў, «у гэтым паўгоддзі стала тры белмовы ў тыдзень. Ужо каторы дзень мой маленькі школьнік у дэпрэсіі». «Часам чытаем на мове, але сын пакуль не вельмі любіць», «і ў нас такая ж гісторыя!»... І гэта ўсё дзеці, якія гадуюцца ў горадзе. Яны чуюць мову гады ў рады. Таму не дзіўна, што не разумеюць сэнс адметных беларускіх слоўцаў. У нас, вясковых дзяцей, у свой час такой праблемы не было. Таму хочацца верыць, што пераезд у вёску — найлепшы падарунак, які я магла зрабіць сваёй радзіме і сыну. Спадзяюся, ужо праз пару гадкоў на Каляды наш беларусік не разгубіцца і возьме разам з іншымі дзеткамі казу у кола. Жыццё пакажа...

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК, фота аўтара.**

# КАБ НЕ ЖЫЦЬ НА СМЕТНІКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У нефармальных абмеркаваннях «смеццевай праблемы» гамяльчане падзяліліся на два лагеры: «чалавек-спажывальнік» і «чалавек-камунальнік». Першыя з аргументамі: я, маўляў, утвараю смецце, а што далей — гэта праблема тых, хто зарплату атрымлівае за збор і перапрацоўку. Другія рэальна заклапочаны праблемай і вераць, што існуючы падыход да смецця можа змяніцца ў найбліжэйшы час.

Здалося, некаторыя гамяльчане і самі не ведаюць, колькі паслядоўных крокаў зрабіў горад, каб увогуле пачаць «разбірацца са смеццем». Гэтыя «разборкі» складаліся з непрыкметных гісторый руплівых сартавальшчыц завода, жыльцоў шматпавярховак, што адмовіліся ад смеццеправодаў, камунальнікаў, што цярпліва прывучалі сартаваць смецце, чыноўнікаў, якія зразумелі, якім чынам адходы ператвараць у даходы.

Згадаем разам. Яшчэ ў сярэдзіне дзевяностых у гомельскай Навабеліцы аднымі з першых у краіне пачалі адмаўляцца ад выкарыстання смеццеправодаў у шматпавярхоўках. Гэта была не толькі санітарная пазіцыя, але адзіная магчымасць увогуле пачаць паасобны збор смецця. У нулявых гомельскія камунальнікі масава ўсталёўвалі бакі для розных відаў адходаў. У 2007 годзе ў Гомелі пачаў дзейнічаць першы тады ў краіне біямеханічны сартавальны завод. Праз некалькі гадоў горад першы з абласных цэнтраў цалкам адмовіўся ад смеццеправодаў.

На заводзе магутнасцю 100 тон за суткі наладжана глыбокая перапрацоўка пластыка і поліэтылена. Там жа працуе цэх па рабоце з буйнагабарытнымі адходамі: ад мэблі да халадзільнікаў. На базе гомельскага прадпрыемства «Спецкамунтранс» дзейнічае падраздзяленне, дзе з адходаў пластыка і плёнкі выплаўляюць люкі, кольцы для калодзежаў і ліўнепрыёмнікі.

Што цяпер? Сёння створанай сістэмы сартавання і перапрацоўкі смецця недастаткова для аб'ёму цвёрдых камунальных адходаў, якія пастаўляюць горад і навакольныя вёскі.


Прадукцыя, якую робяць з перапрацаваных адходаў.

Новая вытворчасць, праект якой распрацоўваецца ў Гомелі, павінна стаць рэгіянальным комплексам абыходжання з адходамі. Гэта не толькі новы палігон, але і сартавальны завод. Тады можна будзе закрыць патрэбы па перапрацоўцы смецця не толькі Гомеля, але і суседніх раёнаў: Гомельскага, Добрушскага, Веткаўскага, Чачэрскага, Лоеўскага і Рэчыцкага. Гэта на перспектыву.

Цяпер жа смеццевы палігон — самы буйны ў Гомельскай вобласці — гэта цэлы гмах у 20 павярхаў.

Апошнія 52 гады сюды звозіліся ўсе гарадскія адходы. Верхнюю частку гары зраўнавалі, засыпалі пяском. Цяпер смецце скідаюць на бакавых пляцоўках. Месца практычна не засталося, прызнаецца **дырэктар Гомельскага прадпрыемства «Спецкамунтранс» Валерый ТКАЧОЎ:**

— Аб'ект не закансерваваны. Зараз аб'ёмы цвёрдых камунальных адходаў, якія паступаюць на палігон, зніжаны на 10 %. Астатняе вымушаны пакуль перанакіроўваць на палігон у Ветку.

Палігон у Гомелі ствараўся ў канцы 60-х. У савецкія часы першапачаткова праекта не было, — працягвае Валерый Ткачоў. — Палігон утварылі на месцы невялікага кар'ера, так вось і застаўся. Даводзілася расці ўверх. Гэта складана ў тэхнічным плане, але выйсця іншага пакуль няма. Праблемай заклапочаны гарадскія і абласныя ўлады, цяпер вядзецца пошук пляцоўкі для новага палігона.

Зараз у Гомельскім гарвыканкаме вызначаюцца з заказчыкам будоўлі. Шляхі фінансавання — сродкі гарадскога бюджэту плюс Міністэрства ЖКГ. Вядома, што для новага аб'екта неабходна пляцоўка не менш чым у 20 гектараў. Пры гэтым складзіраваць плануецца толькі да 30 % смецця. Астатнія аб'ёмы пачнуць перапрацоўваць пад другасную ўпакоўку і біягаз.




Дарэчы, ужо цяпер на гомельскім палігоне працуе вытворчасць альтэрнатыўнай энергіі. Кампанія-інвестар, якая ўзяла ў арэнду частку тэрыторыі, пры дапамозе спецыяльных кампрэсараў выпампоўвае праз свідравіны біягаз. Ён напалову складаецца з метану. Тут жа знаходзіцца і міні-электрастанцыя. У месяц яна вырабляе да 20 мегават электраэнергіі.

На новым аб'екце абавязкова павінны сумяшчацца экалагічныя складнікі і перадавыя тэхналогіі, упэўнены ў «Спецкамунтрансе».

Пры стварэнні новага комплексу трэба ўводзіць аўтаматызаваныя лініі па больш глыбокай перапрацоўцы другасных матэрыяльных рэсурсаў. Метал, шкло, макулатура пойдуць па прызначэнні. З кампосту можна будзе атрымліваць угнаенні.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА. Фота Ірыны АСТАШКЕВІЧ.**


Палігон адходаў за Гомелем.

## «Звязда» спытала

Ці гатовыя гамяльчане пераплачваць за ўпакоўку тавару, зробленую з экалагічна бяспечных матэрыялаў?

**Сафія, маладая маці:** «Я не ведаю, як наогул гэтая розніца ў цане можа быць вылічана, але, думаю, нейкія цалкам адэкватныя сумы. Я гатовая плаціць. Я думаю пра сваіх дзяцей і ўнукаў».

**Максім, студэнт:** «А хто ў краме дакажа, што ўпакоўка іх тавараў рэальна экалагічная? Я не моцна спадзяюся на сумленнасць вытворцаў экалагічнай тары».

**Тацццяна, пенсіянерка:** «Калі ўкладуцца ў прыстойную суму для пенсіянераў, то можна. Увесь свет ідзе да гэтага, мы таксама павінны ісці ў гэтым кірунку».

**Аляксандра, касметолаг:** «У мяне сустрэчнае пытанне: ці будзе гэта зручна? Я асабіста не гатовая насіць малако ў шклянках. І увогуле, лічу, што такія прадукты будуць каштаваць залішне дорага».

**Міхаіл, вайсковец у адстаўцы:** «Усё новае экалагічнае — гэта старое, пра якое забылі. Заварочваць усё ў газеты, як каліcь, вось рашэнне. Выпісваеш, чытаеш, потым — у гаспадарку. Ніякай адмысловай абгорткі і пакункаў».

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

30 СТУДЗЕНЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 2 (15879)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

## Улада АЛЬХОЎСКАЯ:

# «Альбо стабільная работа, альбо літаратура»



**На постсавецкай прасторы маладая беларуская драматургія сёння даволі запатрабаваная. Сярод шматлікіх ужо вядомых нашых аўтараў раптоўна ўспыхнула новая зорачка — Улада Альхоўская. Яе поспех нельга назваць выпадковым: ужо некалькі гадоў дзяўчына выпускае кнігі, а таксама піша сцэнарыі. Пасля перамогі на міжнародным конкурсе сучаснай драматургіі «Час драмы» ў 2018 годзе ў Расіі п'есу «Трыксцер клуб» заўважыў Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр і прапанаваў паставіць спектакль, кожны паказ якога праходзіць з аншлагам. Пасля першага трыумфу былі і іншыя перамогі, высокія ацэнкі журы. Мінулы год Улада завяршыла на высокай ноце: грашовая прэмія, здабытая ў расійскім конкурсе «Аўтара на сцэну», дазволіць ёй убачыць яшчэ адну сваю п'есу ў тэатры. У гутарцы дзяўчына расказала, з чаго пачынала свой шлях да поспеху.**

***— Спектакль «Трыксцер клуб» — адзін з самых яркіх у Маладзёжным тэатры. Як узнікла ідэя п'есы?***

— Напэўна, яна мая маленькая пуцяводная зорка, вяртанне ў свет драматургіі. Некалькі гадоў таму паспрабавала стварыць п'есы, атрымалася не вельмі добра, таму вырашыла займацца іншым жанрам: пісала прозу, мае раманы выходзілі ў Расіі. Пра п'есы больш не задумвалася. Прыкладна год таму з'явілася ідэя, і я зразумела, што задумку лепш рэалізаваць менавіта ў такой форме. П'еса павінна была быць увасоблена артыстамі, якіх пазней я знайшла ў Маладзёжным тэатры. Мне здаецца, што гэта той выпадак, калі ўсе зоркі сышліся...

***— Магчыма, у жыцці быў перыяд, калі даводзілася разбірацца ў сабе, і з духам Трыксцера вы пазнаёміліся асабіста?***

— Думаю, што маленькае чарцяня жыве ў кожным з нас, і гэта насамрэч нядрэнна. Не варта ўспрымаць дух Трыксцера як негатыўны персанаж. Гэта той добразычлівы крытык, які жартуе, іранізуе, але ў рэшце рэшт дапамагае знайсці выйсце з сітуацыі, што не дае спакою. На мой погляд, мы ўсе ў глыбіні душы ведаем рашэнне сваіх праблем. Проста часам яно ўтоена, схавана за туманам штодзённасці, і нам патрэбен штуршок ці нейкі правадыр, які дасць зразумець: усё насамрэч у нашых руках. Уласна, ідэя п'есы ў тым, што мы гаспадары свайго лёсу. Так, ёсць псіхолагі, ёсць Трыксцер ці хтосьці яшчэ, але гэта дапаможныя сілы. Насамрэч рашэнне заключана ў кожным з нас.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*Лесвіца поспеху*

# НОВЫЯ НАВЫКІ — ДЛЯ НОВЫХ СПРАЎ

## Без якіх кампетэнцый «выжыць» на рынку працы будзе немагчыма?



**Як спраектаваць сваю будучыню? Кім быць, каб праз 10—15 гадоў не застацца без работы? Хто са спецыялістаў будзе запатрабаваны? Гэтыя пытанні хвалююць сёння многіх, асабліва тых, хто яшчэ не абраў свой прафесійны шлях. Паводле апошняга глабальнага даследавання працоўных рэсурсаў, дэфіцыт рабочай сілы ў свеце ў 2030 годзе складзе прыкладна 85 мільёнаў чалавек, але востры недахоп будзе абумоўлены адсутнасцю навыкаў, а не людзей. Інтэрнэт рэчаў, аўтаномныя электрамабілі, дроны, робаты, індывідуальныя лекі, створаныя на падставе аналізу ДНК, альтэрнатыўныя крыніцы энергіі, «разумныя гарады»... Усё гэта — ужо сённяшні дзень. Ва ўмовах лічбавізацыі рынак працы зменіцца кардынальна, а многія прафесіі знікнуць назаўсёды. Чацвёртая прамысловая рэвалюцыя і крэатыўная эканоміка ўзмацняюць няроўнасць паміж людзьмі, але актуалізуюцца супярэчнасці не паміж багатымі і беднымі, а паміж людзьмі з высокаразвітымі кампетэнцыямі, прафесіяналамі высокага класа — з аднаго боку, і сярэднімі спецыялістамі — з другога. Працей кажучы, быць сярэднім студэнтам, сярэднім выпускніком, сярэднім спецыялістам становіцца эканамічна нявыгадна.**

**«Новыя навыкі для новых спраў» — менавіта так называлася канферэнцыя, якая прайшла ў рамках праекта «Занятасць, прафесійная адукацыя і навучанне ў Беларусі», што фінансуецца Еўрапейскім саюзам. Эксперты са Швецыі, Германіі, Нідэрландаў, Эстоніі, Літвы, Францыі, Славеніі, Беларусі і іншых краін прадставілі на ёй інавацыйныя практыкі, якія адпавядаюць сістэме навучання на працягу ўсяго жыцця, пазнаёмілі з запатрабаванымі кваліфікацыямі, механізмамі прагназавання кампетэнцый будучыні і сучаснымі стандартамі прафесійнай дзейнасці.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

*Аты—баты, ішлі дзяўчаты...*

# ЧАЦВЁРКА ПЕРШЫХ

## Летась на ваенны факультэт БДУІР упершыню залічылі прадстаўніц прыгожага полу

**Дар'я ГАРБАЧОВА, Валерыя РЫМЧОНАК, Карына ШЧУР і Ангеліна КУДЛАЧ таксама, як і 59 хлопцаў (менавіта столькі аказалася на першым курсе юнакоў), да паступлення прайшлі праз розныя выпрабаванні: медкамісію, тэсты на прафпрыдатнасць, гутарку з псіхолагам, здачу нарматываў па фізпадрыхтоўцы і іншыя. Цяпер дні іх курсанцкага жыцця распісаныя па хвілінах. Як ставяцца да выбару прафесіі бацькі дзяўчат? Як ім вучоба на факультэце? Якія дысцыпліны самыя любімыя?**

Васямнаццацігадовая Дар'я Гарбачова з аграгарадка Турэц Чэрвеньскага раёна ўпэўнена, што ў будучыні стане... палкоўнікам! Зараз для сябе яна абрала спецыяльнасць «Інфакамунікацыйныя тэхналогіі». Курсантка прызнаецца, што прафесійны шлях ёй дапамог выбраць старэйшы брат, які служыць у спецназе.

— Ён часта дзяліўся цікавымі момантамі, звязанымі са службай, мяне гэта прываблівала. Да таго ж мой дзядуля таксама быў вайскоўвец, служыў на падводнай лодцы, так што, можна сказаць, у нас сямейная дынастыя. Памятаю, калі я сказала матулі пра цвёрды намер паступаць на ваенны факультэт, яна вельмі перажывала, але цяпер супакоілася. Лічу, што прафесія вайскоўца дысцыплінуе і арганізоўвае. Акрамя таго, ёсць нейкая рамантыка ў тым, як выглядае дзяўчына ў форме з пагонамі на плячах...

Дар'я падзялілася, што да залічэння на ваенны факультэт паўгода працавала над сваёй фізічнай падрыхтоўкай штодзень. Дзякуючы гэтаму цяпер ёй лягчэй даецца выкананне розных нарматываў.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



Валерыя Рымчонак.

# НОВЫЯ НАВЫКІ — ДЛЯ НОВЫХ СПРАЎ




## «КАНСТРУКТАР» З ВЕДАЎ

Ёсць меркаванне, што ў самых прагрэсіўных галінах праз паўтара-два гады палова ведаў перастане даваць канкурэнтную перавагу. Каб стварыць яе, трэба генераваць новыя веды. Гэта значыць, што якую б ВНУ вы ні скончылі, калі не абнаўляць веды, у найлепшым выпадку іх хопіць на пяць гадоў. Пасля гэтага вы можаце застацца неканкурэнтаздольнымі на рынку працы.

— Сёння мы назіраем нарастаючую нестабільнасць уменняў. Лічбавізацыя змяняе колькасць, профіль, а часта і лакалізацыю рабочых месцаў і задач. Да 2022 года доля асноўных уменняў, якія патрабуюцца для выканання работ, зменіцца на 42 працэнты. Кожнаму другому супрацоўніку будуць патрэбныя сур'ёзная перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі тэрмінам ад шасці месяцаў да года, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі **віцэ-прэзідэнт Festo Didactic SE Андрэас ХЁРСТ.** — Прычым рабочыя месцы і прафесійныя ўменні змяняюцца ва ўсіх эканамічных сферах. Прыкладна трацiна кампаній, апытаных у 2018 годзе, канстатавалі, што будуць браць пад увагу тое, як рабатызацыя паўплывае на іх бізнес-мадэль. Некаторыя пасады проста перастануць існаваць. Шмат відаў работ алгарытмізуецца.

**Soft skills спатрэбяцца ў любой сітуацыі і ў любой прафесіі.**

У перспектыве будуць запатрабаваныя камбінаваныя навыкі і гібрыдныя службовыя абавязкі, якія аб'ядноўваюць розныя дысцыпліны. Узаемадзеянне з разумнымі машынамі патрабуе новых здольнасцяў, высокай ступені самастойнасці ў дзеяннях і самаарганізацыі. Я заклікаю разглядаць хуткасць лічбавізацыі як магчымасць для адукацыі, якая, несумненна, павінна адпавядаць новым патрэбам эканомікі і грамадства.

Як паведаміў у сваім выступленні **кіраўнік прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Дзірк ШУБЕЛЬ,** у 2020 годзе ў краінах Еўрасаюза прыблізна 15 працэнтаў дарослага насельніцтва будзе ўдзельнічаць у розных адукацыйных праграмах. У 2018 годзе імі было ахоплена 11 працэнтаў насельніцтва (12 працэнтаў жанчын і 10 працэнтаў мужчын). Найлепшыя вынікі дасягнуты ў Швецыі, Фінляндыі і Даніі.

У самай найбліжэйшай будучыні адукацыя стане бесперапынным працэсам, «канструктарам» з ведаў, якія чалавек зможа перасабраць самастойна. Знікне і паняцце «прафесія» — яму на змену прыйдзе ўзаемапранікальная сістэма кампетэнцый. Кампетэнцыі — больш, чым проста веды і ўменні. Гэта і першае, і другое плюс псіхасацыяльныя асобасныя якасці, звязаныя з адказнасцю за тое, што мы ведаем і ўмеем прымяняць на практыцы.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

У сярэднім чалавек за жыццё можа змяніць да дзесяці прафесій. З'явяцца цэнтры сертыфікацыі, дзе спецыялісты будуць здаваць кваліфікацыйныя экзамены, якія вызначаюць набор навыкаў і кампетэнцый. Чалавек будзе фарміраваць набор апошніх пад запыты канкрэтных вакансій. А штучны інтэлект падкажа, якіх ведаў яму не хапае, чаму і як трэба вучыцца.

**Незалежны кансультант у вобласці прафарыентацыі, эксперт Саша НІКЛАНОВІЧ (Славенія)** звяртае ўвагу на наступную акалічнасць: змена работы знаходзіцца на трэцім месцы сярод стрэсавых фактараў. Таму прафесійнае арыентаванне павінна нас суправаджаць на працягу ўсяго жыцця...

**У сярэднім чалавек за жыццё можа змяніць да дзесяці прафесій.**



## ПАД ПАТРЭБЫ НАЙМАЛЬНІКАЎ

**Берціл ОСКАРСАН, эксперт па прафесійным навучанні і навучанні дарослых,** паведаміў, што ў Швецыі дзейнічае Нацыянальнае агенцтва вышэйшай прафесійнай адукацыі. Яно адказвае за распрацоўку і падтрымку Шведскай нацыянальнай рамкі кваліфікацый і забяспечвае прафесійнае навучанне ў 14 розных галінах, напрыклад, будаўніцтве, вытворчасці, ахове здароўя, сацыяльнай сферы, рэстараннай справе, турызме, транспарце, сельскай гаспадарцы, экалогіі і нават у журналістыцы.

Вучоба можа доўжыцца ад шасці месяцаў да двух гадоў, але для таго, каб праграма прывяла да атрымання сертыфіката пятага або шостага ўзроўню еўрапейскай рамкі кваліфікацый, яна павінна доўжыцца мінімум адзін год.

Праграмы прапануюцца ў абласцях, дзе ёсць ярка выражаны попыт на пэўныя кампетэнцыі (патрабуецца дакументальнае пацвярджэнне гэтага факта). Калі ў пастаянна дзеючых установах адукацыі не рыхтуюць патрэбных на рынку працы спецыялістаў, то навучальныя ўстановы разам з наймальнікамі могуць звяртацца ў агенцтва для арганізацыі іх навучэння. Прычым работадаўцы абавязкова бяруць удзел у прафесійным навучанні: сама меней 25 % зместу праграмы вывучаецца непасрэдна на вытворчасці.

Работадаўца выступае асноўным пастаўшчыком паслугі або суарганізатарам, дае пляцоўку для навучання на рабочым месцы, з'яўляецца членам кіруючага камітэта праграмы навучання і можа забяспечыць выпускнікоў рабочым месцам (але гэта неабавязкова).

Заяўка на арганізацыю праграмы адкрываецца ў красавіку кожнага года на наступны год. Навучацца могуць як учарашнія школьнікі, так і дарослае насельніцтва. Некаторыя праграмы патрабуюць атрыманых раней ведаў, напрыклад заканчэння спецыяльных курсаў па нацыянальнай праграме на ўзроўні старшай сярэдняй школы, або спецыяльнага прафесійнага вопыту.

Паспяховыя заяўкі атрымліваюць фінансаванне з разліку на канкрэтнага навучэнца. Яго ўзровень залежыць ад тыпу навучання і ў сярэднім складае 6300 еўра на аднаго навучэнца ў год, але можа вар'іравацца ад 5500 да 9000 еўра. Гэтыя лічбы не ўключаюць матэрыяльную дапамогу навучэнцам, якая паступае з іншай крыніцы фінансавання (прыблізна 9 тысяч шведскіх крон, або 900 еўра). А вось браць плату за навучанне не дапускаецца.

У 2018—2019 гадах па 496 праграмах навучаліся 36 тысяч чалавек. Колькасць прэтэндэнтаў на даступнае месца складала ў сярэднім 1,8 чалавека. Праз шэсць месяцаў пасля заканчэння падрыхтоўкі 93 % слухачоў такіх адукацыйных праграм працаўладкоўваюцца або арганізуюць самазанятасць (52 % былі нанятыя кампаніямі, у якіх яны праходзілі навучанне на вытворчасці). 91 % навучэнцаў і 70 % наймальнікаў задаволеныя або вельмі задаволеныя вынікамі навучання.

## НА «МОВЕ ДРАКОНА»

Як больш эфектыўна вучыцца: на памылках ці на сітуацыі поспеху? **Паўлюс ДАБАЖЫНСКАС, урач-рэаніматолаг, доктар медыцыны, выкладчык Універсітэта навукі і здароўя (Літва),** упэўнены, што ў медыкаў усе навыкі павінны быць даведзены да аўтаматызму.

— Я добра памятаю, як пасля заканчэння навучання прыйшоў на работу і мне давялося аказваць дапамогу пацыенту, які пацярпеў у дарожна-транспартным здарэнні, — кажа ён. — Тэарэтычна ведаю, што рабіць, але ў стрэсавай сітуацыі разгубіўся. Той раз чалавека выратавалі, але я стаў думаць, што трэба з гэтым штосьці рабіць. Будучыя ўрачы выходзяць з медыцынскага ўніверсітэта з ведамі, якія не могуць прымяніць на практыцы... Ёсць такая статыстыка: 80 % выпускнікоў — гэта лузеры, 17 % — урачы, да якіх можна ісці лячыцца, і толькі 3 % — урачы ад Бога. Рашэнне праблемы мы падгледзелі ў стваральнікаў касмічнай праграмы. Над распрацоўкай інфармацыйнай сістэмы для касмічнай станцыі было задзейнічана каля 60 тысяч чалавек. Калі на арбіце адбываецца нейкі тэхнічны збой, на Зямлі трэба яго тэрмінова ліквідаваць. А паспрабуйце знайсці таго, хто адказваў за канкрэтны ўчастак агульнай работы! Таму была створана алгарытмічная мова і ўсе самыя складаныя працэсы прапісаны так, каб любы супрацоўнік цэнтра кіравання мог разабрацца і выправіць хібы.

Мы пайшлі аналагічным шляхам: стварылі «мову дракона» і мадэль гібрыднага навучання, якая спалучае элементы электроннага навучання, узаемнага навучання, практычнага навучання сімуляцыям і элементы навучання прафесійнаму майстэрству з выкарыстаннем пакрокавых алгарытмаў і сімуляцыі сітуацый. Звычайныя сімуляцыйныя цэнтры, якія выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы медыкаў, маюць шмат мінусаў: гэта абавязковая наяўнасць інструктара-прафесіянала, навучанне ў вялікіх групах, калі адзін штосьці робіць, а іншыя толькі глядзяць, абмежаваны час доступу ў вучэбную аўдыторыю і іншыя недахопы.

Наша аўтаматызаваная сістэма кіравання сімуляцыйным цэнтрам заснаваная на алгарытмах паспяховага навучання, таму што на хвалі ўдачы вучоба ідзе прасцей. **Сітуацыйнае алгарытмічнае навучанне дазваляе ўсе магчымыя сцэнарыі давесці да поўнага аўтаматызму.** Студэнт праходзіць чатыры стадыі навучання: ад несвядомай і свядомай некампетэнтнасці да свядомай і несвядомай кампетэнтнасці. Вучоба адбываецца ў маленькіх групах па тры чалавекі і не патрабуе прысутнасці інструктара. Апошні знаходзіцца на адлегласці, ён не з'яўляецца крыніцай ведаў, а забяспечвае кантроль за працэсам (у зручны для яго час), выкананне студэнтамі кантрольных сцэнарыяў і сертыфікацыю ведаў. Навучанне можа доўжыцца 24 гадзіны ў суткі або столькі, колькі забяспечваецца доступ у «Гібрыд-лаб».

## ВАЖНАСЦЬ КРЫТЫЧНАГА МЫСЛЕННЯ

Многія эксперты на канферэнцыі звярталі ўвагу на актуальнасць так званых мяккіх навыкаў (soft skills). Ёсць думка, што паспяховасць чалавека ў прафесійнай сферы на 85 працэнтаў залежыць ад іх. Soft skills спатрэбяцца ў любой сітуацыі і ў любой прафесіі. Іх яшчэ называюць сацыяльнымі навыкамі, таму што размова ідзе пераважна пра ўзаемадзеянне паміж людзьмі.

Маюцца на ўвазе такія якасці, як уменне выказваць сваё меркаванне і пры гэтым не ўшчамляць іншых, уменне весці дыялог з аўдыторыяй, аргументавана дыскутаваць, прадухіляць і «гасіць» канфлікты, фармуляваць мэты і ставіць задачы, а таксама гнуткасць, уменне працаваць у камандзе, генерыраваць і камбінаваць ідэі, стрэсаўстойлівасць, уменне канцэнтравацца, прэзентацыйная ўпэўненасць, самаарганізацыя, гатоўнасць браць на сябе адказнасць, прыстасоўвацца да інавацый. Увогуле, калі трапляеш у новы калектыў, неабходна быць гнуткім і лёгка адаптавацца да перамен, таму без «мяккіх навыкаў» проста не абысціся...

Эксперты Сусветнага эканамічнага форуму ў Давосе сфарміравалі пералік кампетэнцый, які ўключае дзесяць пунктаў. Сярод іх комплекснае вырашэнне праблем, крытычнае мысленне, крэатыўнасць, уменне кіраваць чалавечымі рэсурсамі, узаемадзейнічаць з іншымі людзьмі, эмацыянальны інтэлект (эмпатыя ў рабоце не менш важная, чым узровень IQ), адказнасць за прыняцце рашэнняў, кліентаарыентаванасць, уменне весці перагаворы, кагнітыўная гнуткасць (здольнасць розуму хутка пераключацца з адной думкі на іншую, а таксама адбудаваць некалькі рэчаў адначасова).

**Важнасць крытычнага мыслення расце (яно знаходзіцца на другой пазіцыі), а вось яго распаўсюджанасць адстае.** Каб арыентавацца ў вялізным інфармацыйным свеце, патрабуюцца два ўменні. Першае — весці пошук інфармацыі, аналізаваць яе. І другое, самае галоўнае, — уменне выбудоўваць сувязі паміж здабытай інфармацыяй і атрыманымі раней ведамі і ўбудоўваць новую інфармацыю ў задачы і праблемы, што ўзнікаюць.

І напрыканцы адна **парада ад экспертаў: правярайце, чаму вы навучыліся за тыдзень, месяц, год...** Калі адкідаць гэтую думку і апраўдвацца тым, што занадта занятыя аператыўнымі задачамі і справамі, то праз некаторы час убачыце, што вы засталіся на ранейшым месцы, а свет пайшоў наперад, і ваша канкурэнтаздольнасць на рынку працы рэзка знізілася.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*У гонар Перамогі*

# Па месцах славы нашых прадзедаў

**Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка да 31 студзеня праводзіць інтэрнацыянальны 55-ы «Зорны паход» па месцах баявой і працоўнай славы беларускага народа. Гэты праект рэалізуецца вядучай педагагічнай ВНУ краіны з 1966 года. Сёлета ён прысвечаны 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**

Удзельнікі — больш за 270 студэнтаў і выкладчыкаў — запланавалі наведаць Барысаўскі, Вілейскі, Пухавіцкі, Слуцкі і Салігорскі раёны Мінскай вобласці, Пінскі раён Брэсцкай вобласці, Аршанскі раён Віцебскай вобласці, Смаргонскі раён Гродзенскай вобласці, Асіповіцкі раён Магілёўскай вобласці.

Падчас паходу студэнты і выкладчыкі сустрэнуцца з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, акажуць ім шэфскую дапамогу, правядуць мітынгі і ўскладуць кветкі да брацкіх магіл воінаў і мірных жыхароў, якія загінулі ў гады вайны, выступяць з канцэртнымі праграмамі ў школах рэгіёнаў, правядуць прафарыентацыйныя сустрэчы са старшакласнікамі, арганізуюць майстар-класы і спартыўныя спаборніцтвы.

Разам са студэнтамі БДПУ, у тым ліку замежнымі студэнтамі з Туркменістана і Кітайскай Народнай Рэспублікі, у «Зорным паходзе» бяруць удзел студэнты Еўразійскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Л. М. Гумілёва (Рэспубліка Казахстан), Маскоўскага педагагічнага дзяржаўнага ўніверсітэта (Расійская Федэрацыя), Новасібірскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта (Расійская Федэрацыя), Расійскага дзяржаўнага прафесійна-педагагічнага ўніверсітэта (Расійская Федэрацыя), Ташкенцкага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Нізамі (Рэспубліка Узбекістан).

У рамках святкавання 75-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне праводзіцца рэспубліканская акцыя «У славу агульнай Перамогі!». Удзельнікі «Зорнага пахода» далучацца да яе і возьмуць удзел у заборы зямлі з брацкіх магіл воінаў і мірных жыхароў, што загінулі ў гады вайны на тэрыторы раёнаў, якія наведаюць удзельнікі мерапрыемства, а затым перададуць капсулы для размяшчэння іх у крыпце Храма-помніка ў гонар Усіх Святых.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Свая вышыня*

# Ведаць і памятаць праўду пра вайну

**Кадэцкія каманды з усёй краіны 28 лютага сустрэнуцца ў сценах міліцэйскай альма-матар на інтэлектуальна-творчай алімпіядзе «Патрыёт», паведамілі ў МУС. Маладзёжны форум штогод праводзяць сталічная ведамасная ВНУ і Беларускі саюз сувораўцаў і кадэтаў. Цяперашні, ужо пяты, прысвечаны 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У барацьбе сыдуцца каманды кадэцкіх і сувораўскага ваенных вучылішчаў, спецліцэяў МУС і МНС.**

Як і раней, самым эрудзіраваным трэба будзе прайсці пісьмовае тэсціраванне. А таму ў гэтыя дні настольнай кнігай удзельнікаў стаў навучальны дапаможнік «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» для 11 класаў. Імёны, факты, даты і многае іншае ўключана ў бліц-апытанне капітанаў каманд. Арганізатары таксама папярэдзілі: спытаюць удзельнікаў і пра кадэцкі рух з яго багатай гісторыяй і вядомымі дзеячамі.

На алімпіядзе выступяць прамоўцы — з тэмамі многія ўжо вызначыліся. Гаварыць будуць пра афіцэрскія сем'і і ўдзел прадзедаў у Вялікай Айчыннай вайне, а таксама паразважаюць аб прызванні, выбары прафесіі і важнасці вучобы. Журы паставіць адзнакі за раскрыццё тэмы, высновы, арыгінальнасць, артыстычнасць і адукаванасць.

Адзін з конкурсаў прысвечаны ваенным кінастужкам. Арганізатары прапанавалі да прагляду сем фільмаў, сярод іх «Балада пра салдата» 1959 года («Масфільм») і «Бітва за Севастопаль» 2015 года (Расія — Украіна). Для пераможцаў неабходна ведаць не проста сюжэт у агульных рысах, а ўсіх герояў, сітуацыі, у якіх яны апынуліся, праблемы, з якімі сутыкнуліся...

У канцы алімпіяднага дня традыцыйна праходзіць самы яркі конкурс на найлепшую інсцэніроўку ўрыўка з літаратурнага твора. Сёлета для падрыхтоўкі сцэнарыя ўдзельнікам прапанавалі шэраг новых твораў — ад верша «Чакай мяне» Канстанціна Сіманава да рамана «У спісах не значыўся» Барыса Васільева.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Пасябраваць з музай*

# Не жадаеце пакінуць творчы «Аўтограф»?

**У Беларусі аб'яўлены конкурс літаратурнай творчасці студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі «Аўтограф-2020». Праект, прысвечаны 75-й гадавіне Вялікай Перамогі і Году малой радзімы, пройдзе са студзеня да лістапада 2020 года.**

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі дзённай формы навучання — індывідуальныя аўтары і аўтарскія калектывы, творчыя аб'яднанні, літаратурныя гурткі, студыі.

Тэматыка работ: «Трылогія малой радзімы: існасць», «Код гісторыі: равеснік, подзвіг, перамога», «Сваімі словамі: нарысы пра будучыню». Работы прадстаўляюцца ў наступных жанрах, кірунках і формах літаратурнай творчасці: паэзія — балада, верш, верш у прозе, цыкл вершаў; проза — апавяданне, навела, мініяцюра, урывак з аповесці, кароткая аповесць; публіцыстыка — эсэ, нарыс, інтэрв'ю, рэпартаж, маналог, біяграфічныя нататкі; фантастыка — творы празаічнага і паэтычнага жанраў — футуралагічнае эсэ, інтэрв'ю з выдуманымі героямі, лісты ў будучыню, падарожжа ў мінулае.

Конкурс праводзіцца ў два этапы. Работы (друкаваны асобнік і электронная версія на CD) да 30 верасня 2020 года неабходна адправіць на адрас Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі з пазнакай «Аўтограф». Затым рэспубліканскае журы вызначыць пераможцаў (I месца) і прызёраў (II і III месцы) у кожнай намінацыі.

Узнагароджанне пераможцаў і прызёраў адбудзецца ў лістападзе 2020 года падчас мерапрыемстваў рэспубліканскага маладзёжнага форуму. Палажэнне аб правядзенні конкурсу размешчана на сайтах арганізатараў: Міністэрства адукацыі і Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Пашыраючы прастору*

# Крэатон-культура



**У сталіцы самага вядомага фэсту на постсавецкай прасторы «Славянскі базар у Віцебску», на радзіме Марка Шагала, адбыўся крэатон для старшакласнікаў. Хлопцы і дзяўчаты ў камандах думалі-гадалі, як завабіць моладзь у музеі і наогул выклікаць інтарэс да культуры. Мерапрыемства адбылося ў рамках сацыяльна-адукацыйнага праекта «Першыя», які рэалізуецца кампаніяй А1 пры падтрымцы арганізатараў канферэнцыі TEDxMinsk.**

Дарэчы, стваральнікі крэатону былі прыемна здзіўлены вялікай колькасцю ўдзельнікаў. У выставачнай зале Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва літаральна было цесна 130 школьнікам з абласнога цэнтра, Полацка, Навалоцка, Оршы, а таксама з Маладзечна і Мінска.

Фармат мерапрыемства адразу спадабаўся яго галоўным героям. Яны паглядзелі невялікія фільмы з аповедамі славутых людзей пра тое, як тыя бралі ўдзел у праектах у сферы культуры. У наш час моладзь мае шанц нават у школьныя гады заявіць пра сябе на ўвесь свет. Дзеля гэтага крэатыўная каманда кампаніі А1 і ажыццяўляе задуманае.

Школьнікі вельмі ўважліва слухалі выступленні экспертаў — асабліва Андрэя Духоўнікава, дырэктара Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва. Нядаўна ён быў удастоены прэміі «За духоўнае адраджэнне». Віншуючы ўдзельнікаў крэатону, спікер запрасіў усіх бясплатна наведаць музейную ўстанову на вуліцы М. Шагала. Кожны госць горада проста павінен прыйсці ў будынак, дзе працавалі Шагал, Малевіч, Лісіцкі. Менавіта ў тых сценах, якія цудам захаваліся падчас вайны, нараджалася




новае мастацтва, дзякуючы якому правінцыйны Віцебск калісьці стаў сталіцай авангарду. У складзе музейнай установы ёсць яшчэ адзін помнік архітэктуры — на вуліцы Талстога. Там прастора бясплатна перадаецца творчым людзям пад рэалізацыю іх мастацкіх ідэй. Несумненна, гэты факт вельмі блізкі да ідэі крэатону.

Усе прапанаваныя школьнікамі ідэі разглядалі мясцовыя эксперты па вызначаных тэмах, прадстаўнікі кампаніі А1 і акадэмічнай супольнасці. Яны звярталі ўвагу на крэатыўнасць і навізну прапаноў, арыгінальнасць і нестандартнасць вырашэння пастаўленых пытанняў, рэалістычнасць задум і магчымасць іх увасаблення, а таксама паспяховасць прэзентацыі. Каманды з самымі ўдалымі і цікавымі ідэямі атрымалі падарункі, а ўсе выступоўцы — карысныя парады ды каментарыі ад экспертаў.

А журналісты, літаральна як да зорак мастацтва, займалі чэргі, каб пагутарыць з пераможцамі віцебскай часткі крэатону.

У прыватнасці, мясцовая школьніца Насця Шчаглова расказала, што задумка яе каманды — выкарыстоўваць галаграмы падчас экскурсій. І чаму б маладым музейным валанцёрам не вадзіць па залах равеснікаў? Наогул, было б вельмі здорава, каб у Беларусі з'явіўся музей мемаў! Моладзь і дзеці дакладна б захацелі туды схадзіць.

А мінчанін Назар Ягораў упэўнены, што трэба ўвекавечыць памяць Кастуся Каліноўскага і іншых нашых славутых землякоў, каб іх імёны насілі станцыі метро, вуліцы і паркі ў цэнтрах гарадоў.

Падобныя крэатоны пройдуць 1 лютага ў Магілёве («Першыя ідэі: інклюзія»), 15 лютага ў Гродне («Першыя ідэі: тэхналогіі») і 29 лютага ў Гомелі («Першыя ідэі: экалогія»).

Кожны ўдзельнік конкурсу цягам навучальнага года распрацоўвае сваю ідэю, а для ўдзелу ў фінале будуць адабраныя дзесяць старшакласнікаў. Яны атрымаюць круты прыз — iPhone Xs. А яшчэ гарантуецца, што пад кіраўніцтвам персанальнага ментара хлопцы і дзяўчаты прадставяць свае ідэі на маштабнай маладзёжнай канферэнцыі TEDxYouth@Minsk.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота дадзены арганізатарамі.**



ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
30 01 2020 г.

*Погляд праз час*

# ПАЦЭЛІЦЬ У ЯБЛЫЧАК

## Малады ратавальнік даследуе снайперскі рух

**Юрый ГАРАЕЎ у 11 класе заняў трэцяе месца на рэспубліканскай алімпіядзе па працоўным навучанні. Пасля школы вырашыў, аднак, звязаць свой лёс з работай у структурах Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, таму і паступіў ва Універсітэт грамадзянскай абароны (УГА).**

У канцы мінулага снежня ў Расіі праходзіў XXVI Міжнародны навукова-даследчы конкурс «Найлепшы студэнцкі артыкул 2019». Юрый Гараеў атрымаў на ім дыплом І ступені ў секцыі «Гістарычныя навукі». Яго работа была прысвечана тэорыі і практыцы снайперскага руху падчас Вялікай Айчыннай вайны. Як жа ўдаецца маладому чалавеку ўсё сумяшчаць?

— Я вельмі даўно захапляюся вывучэннем падзей часоў ваеннага ліхалецця. У мяне ваявалі і дзяды, і прадзеды. Адзін з іх браў удзел у Сталінградскай бітве. Там жа ваяваў і легендарны снайпер Васіль Зайцаў, на рахунку якога ўсяго за месяц было 225 знішчаных гітлераўцаў і іх саюзнікаў, у тым ліку — 11 снайпераў. Прадзед пра яго вельмі шмат чуў. Як і пра Феадосія Смалячкова, які ваяваў на Ленінградскім фронце і чыім імем названа вуліца ў Мінску. Пасля ён расказаў пра гэта свайму сыну — майму дзеду. І вось так па ланцужку пакаленняў інфармацыя дайшла і да мяне. Ваенн ай гісторыяй вельмі моцна цікавіцца і мой тата. Разам з ім мы прачыталі шмат літаратуры, пагледзелі безліч фільмаў. Хоць тата — звычайны выкладчык фізікі ў школе. А вось цётка якраз-такі з'яўляецца гісторыкам. Яна і дапамагла сістэматызаваць атрыманыя звесткі.

Суразмоўнік прызнаецца: цікавіцца менавіта снайперскім рухам ён пачаў дзякуючы ўлюбёнаму віду спорта — біятлону.

— Але з пошукам інфармацыі было цяжкавата. Старыя кнігі, газеты, часопісы дагэтуль алічбаваны не ўсе. Таму


Фота УГА.

давялося шмат гадзін правесці ў бібліятэках, шукаючы патрэбныя звесткі. На ўсё спатрэбілася прыблізна тры месяцы. Абарона навуковай работы была завочнай, праходзіла яна ў Пензе. І вось у апошні дзень 2019 года прыйшла навіна пра перамогу. Радаваліся і я, і мой навуковы кіраўнік, кандыдат філалагічных навук дацэнт Любоў Луц, і бацькі. Ёсць жаданне ўдзельнічаць і ва ўнутрыбеларускіх конкурсах. Буду развіваць даследаванне снайперскага руху сярод жанчын. Але пакуль што я ўзяў паўзу на час сесіі. Скончацца іспыты, крыху адпачну — і зноў сяду за работу.

Юрый Гараеў вучыцца на другім курсе, з'яўляецца яго старшыной. У падпарадкаванні хлопца — 53 чалавекі. Сярэдні бал у суразмоўніка — 8,5.

— Спачатку думаў пайсці вучыцца на архітэктара пасля 9 класа, — згадвае юнак. — Я вельмі добра рабіў чарцяжы. Гэта ўменне мне яшчэ спатрэбіцца, калі ў нас будзе прадмет, прысвечаны бяспечнай эксплуатацыі будынкаў. Але ў той час бацькі мяне адгаварылі ад такога кроку. Сумесна вырашылі, што лепш атрымаць сярэднюю адукацыю ў школе, а ўжо пасля выбіраць свой прафесійны шлях. І ўжо праз год мае інтарэсы змясціліся з архітэктуры на энергетыку. Думаў паступаць на адпаведны факультэт у БНТУ, але ўсё вызначыў выпадак. Калі я знаходзіўся на рэспубліканскай алімпіядзе па працоўным навучанні ў Магілёве, патэлефанаваў бацька і расказаў, што прыйшла брашура з Міністэрства па надзвычайных сітуацыях — магчыма, гэта мне будзе цікава. Але канчатковы выбар усё роўна заставаўся за мной. Я схадзіў у раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях па месцы жыхарства, параз маўляў з супрацоўнікамі і... пераканаўся, што хачу паступаць менавіта ва Універсітэт грамадзянскай абароны. Здаў іспыты — і стаў курсантам.

Чаму ж вучыцца Юрый Гараеў?

— Наша задача ў будучым — прафілактыка, каб не адбылося ўзгарання. Таму мы падчас практыкі наведваемся ў розныя калектывы. А для таго каб данесці інфармацыю, трэба размаўляць са сваім візаві на яго мове. Менавіта таму падлеткі ва ўзросце 14—17 гадоў — самы няпросты кантынгент. Але гэта не азначае таго, што трэба «націскаць на паўзу», зусім не. Нас знаёмяць з падлеткавай псіхалогіяй, паказваюць тэматычныя фільмы, тэлеперадачы. Тое, што напісана ў падручніку, — база. Але толькі на ёй усе аспекты не ахопіш. Цяпер у нас самы цікавы прадмет — тэорыя гарэння. Адначасова ён і самы складаны.

— Не кожны чалавек здолее быць лідарам у падраздзяленні, — кажа **начальнік курса падпалкоўнік унутранай службы Уладзімір АПАНОВІЧ.** — Падпарадкоўвацца могуць усе. Кіраваць — не. Юрый стрэсаўстойлівы і вельмі вытрыманы. У калектыве заўжды можа нешта адбыцца, і задача старшыны курса — прыняць своечасовае і правільнае рашэнне, а таксама ўзяць на сябе адказнасць...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ЧАЦВЁРКА ПЕРШЫХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Таксама ў мяне атрымліваецца вучыцца «на выдатна», таму я часам маю прывілеі ў выглядзе дадатковых звальненняў. Увогуле, вучобе мы ўдзяляем шмат часу, мне больш за ўсё падабаюцца ваенныя дысцыпліны. З дзяўчатамі жывём у асобным блоку ў інтэрнаце. У вызначаны час маем магчымасць патэлефанаваць родным, — падзялілася студэнтка.

Сямнаццацігадовая Валерыя Рымчонак з Віцебска вучыцца на той жа спецыяльнасці, што і Дар'я. Са спортам сябруе ўжо шмат гадоў, таму выкананне нарматываў для паступлення прайшло для яе без узмоцненай падрыхтоўкі. Ваенны факультэт БДУІР дзяўчына лічыць для сябе вельмі перспектыўным, таму і намаганні для далейшай рэалізацыі ў кар'еры прыкладае немалыя.

— Яшчэ ў дзяцінстве зразумела, што буду ваеннай. Глядзела фільмы пра вайну і ўяўляла сябе на месцы герояў, а калі пасталела, жаданне трапіць у гэтую сферу толькі ўзмацнілася. Вызначыўшыся з установай адукацыі, вельмі перажывала, былі сумненні ва ўласных магчымасцях. Хваляванне заставалася, нават калі прыйшло ўсведамленне, што маю высокія балы для залічэння на курс — амаль 350. У мяне ёсць дакладнае разуменне, што хачу служыць на карысць нашай краіны. Спадзяюся, усё атрымаецца, — кажа Валерыя.

Дарэчы, наша гераіня найлепшая ў вучобе на курсе, яна бярэ ўдзел у розных спартыўных спаборніцтвах, дзе займае прызавыя месцы. Родных Валерыя бачыць часта: «Часам нават засумаваць не паспяваю *(усміхаецца)*. Вучыцца на ваенным факультэце няцяжка, наадварот, падабаюцца дысцыпліна, дакладны распарадак дня».

Курсанткі Карына Шчур і Ангеліна Кудлач разам адвучыліся ў кадэцкім вучылішчы, а пасля вырашылі паступаць на ваенны факультэт.

— Бацькі да апошняга думалі, што аддам перавагу звычайнай ВНУ. Але я зрабіла па-свойму. Фізічная падрыхтоўка пры паступленні была адным з галоўных аспектаў, падчас курса маладога байца нас правяралі на трываласць. Цяжкія для мяне аказаліся выпрабаванні з бронекамізэлькай. Але я з усім справілася, паступіла на спецыяльнасць «Вылічальныя машыны, сістэмы і сеткі» і вельмі гэтаму рада. У мяне ёсць мэта — даслужыцца да высокага звання ў ваеннай справе, — падзялілася сямнаццацігадовая Карына.


З мамай пасля прынясця воінскай прысягі.

Васямнаццацігадовай мінчанцы Ангеліне Кудлач абраць прафесію па душы дапамог прыклад старэйшага пакалення. Яе дзядуля служыў у органах унутраных спраў. Рашэнне адвучыцца ў кадэцкім вучылішчы падтрымала і матуля:

— Пасля вучобы ў гэтай установе задумалася: ці варта працягваць? Але адразу ж адказала сабе — так, ніякія цяжкасці мяне не палохаюць. Ведала, што пры паступленні на ваенны факультэт БДУІР будзе няпроста. Але мне пашанцавала, з боку родных была велізарная падтрымка. Навучацца ваенным дысцыплінам мне па душы. Упэўнена, што сюды лепш паступаць хлопцам і дзяўчатам з моцным характарам, тым, хто гатовы развівацца і духоўна, і фізічна.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва Валерыі Рымчонак.**

*Знайсці сябе*

# У прафесію — праз сайт

**Убачыць праблему, сабраць інфармацыю, арганізаваць каманду — складаныя, але выканальныя задачы для магістранткі БДУ Валерыі АМЯЛЮСІК. Так, пачынаючы ўсяго толькі з ідэі, яна ажыццявіла свой праект — запусціла сайт teenjob.by. Дзякуючы яму падлеткі маюць магчымасць яшчэ ў школе набыць шырокія веды пра розныя прафесіі.**

Цяпер на партале ёсць тры раздзелы: «Стажыроўкі», «Валанцёрства» і «Мерапрыемствы». У першых двух любая кампанія можа размясціць сваю аб'яву, указаўшы сферу дзейнасці і абавязкі. Малады чалавек можа стаць рэпарцёрам ці, напрыклад, дапамагчы ў арганізацыі фестывалю. А калі клікне на «Мерапрыемствы» — трапіць на фільм, навучальны курс па фатаграфіі або прадпрымальніцтве ці на сустрэчу з прафесіяналамі ў сферы вэб-распрацовак.



— Спадзяюся, што наш праект дапаможа маладым людзям выбіраць прафесію больш усвядомлена, дасць матывацыю вучыцца пасля школы, самастойна шукаць літаратуру, наведваць лекцыі, канферэнцыі, — дзеліцца Валерыя.

...А пачыналася ўсё ў дзяцінстве. Спачатку Лера з сяброўкай шукала і карміла бадзяжных катоў. «Мама заўсёды сварылася, што я выпацканая», — смяецца дзяўчына. Піянеркай яна дапамагала ветэранам. «З адным мы нават пасябравалі, прыходзілі да яго проста так, паразмаўляць, пагуляць у нарды», — успамінае яна. Стаўшы студэнткай факультэта сацыякультурных камунікацый, узялася за даследаванне сацыяльнай сферы больш грунтоўна. Шукала грамадскія арганізацыі, цікавыя праекты, глядзела, што ў іх рамках можна зрабіць.

Дзякуючы такому досведу студэнтка нарэшце змагла ажыццявіць уласны праект. Яшчэ ў ліпені 2018-га была толькі задумка. Спатрэбілася і цярпенне, і плённая праца, і нават удача. Спачатку для дыпломнай работы яна правяла даследаванне, каб зразумець, ці патрэбен увогуле тынэйджарам такі праект. У выніку са 129 апытаных 98 % пацвердзіла яго значнасць. Ажыццяўленне ідэі заняло крыху больш за год. Цяпер над праектам працуе цэлая каманда.

Бліжэй да лета на teenjob.by плануюць дадаць і раздзел «Падпрацоўкі». Таксама распрацоўшчыкам хочацца, каб дзейнічаў блог, які маглі б запаўняць самі падлеткі. «Можна было б правесці для іх стажыроўку, навучыць збіраць інфармацыю, пісаць матэрыялы», — разважае магістрантка. Важна знайсці і фінансавую падтрымку.

У Валерыі ёсць погляд і на тое, як школьнікам зразумець, чым яны хочуць займацца ў дарослым жыцці:

— Як чалавек, які вывучае псіхалогію, раю прыслухоўвацца да сябе. Зразумець, што падабаецца больш, да чаго ляжыць душа. Спытаць самога сябе: ты больш сацыяльны чалавек, камунікабельны ці той, які хоча працаваць з прадметамі? Спрабаваць сябе ў розных сферах дзейнасці, хадзіць на іvэнты, выкарыстоўваць усе магчымасці для атрымання досведу. Прыкладна ў 14—16 гадоў падлетак ужо разумее свой патэнцыйны кірунак і з патоку інфармацыі можа выбраць патрэбную, вырашаць, ці сапраўды гэта падабаецца.

Сама дзяўчына невыпадкова паступіла на спецыяльнасць «сацыяльнае праектаванне». У школе яе цікавілі ўзаемаадносіны паміж аднакласнікамі, іх паводзіны, а таксама нервовая сістэма чалавека. Цяпер жа яна працягвае займацца псіхалогіяй, піша магістарскую дысертацыю.

**Юлія АДАМОВІЧ.**

*У нагу з часам*

# ЯК ДАЦЬ ПЛАСТЫКУ ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ,

## або Замахнуцца на самую доўгую лавачку ў свеце

**Уявіце, што адходы, якія выкідваюцца кожны дзень, не адпраўляюцца на звалкі і не закопваюцца на палігонах, а ператвараюцца ў прадметы дэкору, мэблю, вулічныя ліхтары. І вы, адпраўляючы ў сметнік бутэльку ад газіроўкі, не пакідаеце пластык стагоддзямі ляжаць у зямлі, а ўдзельнічаеце ў стварэнні новых рэчаў.**

Нядаўна каманда беларускіх інжынераў smARTech знайшла незвычайны спосаб утылізаваць гэты другасны матэрыял: з двух тысяч бутэлек на 3D-прынтары можна будзе надрукаваць лавачку. У планах распрацоўшчыкаў — уладкаванне праз гэта паркаў, двароў і пляжаў, дапамога інклюзіўным людзям і стварэнне арт-аб'ектаў. Як запэўніваюць у smARTech, спіс магчымасцяў іх праекта ReBottle абмежаваны толькі фантазіяй.

— Тры гады таму мы пачалі займацца 3D-друкам, — апавядае **Кірыл ДОРАХ, адзін з заснавальнікаў праекта.** — Самі рабілі і прадавалі прынтары, займаліся рамонтам, друкавалі на заказ. А восенню прыйшла ідэя сумясціць наш вопыт з вырашэннем праблемы перапрацоўкі пластыку. Вырашальным трыгерам стала навіна пра тое, што Сусветны фонд дзікай прыроды запусціў анлайн-трансляцыю раскладання бутэлькі, якая будзе доўжыцца 450 гадоў.



**Кірыл Дорах *(другі справа)* са сваёй камандай.**

Тэма актуальная, і распрацоўшчыкі прыдумалі комплекс, які зможа ператварыць галоўны недахоп ПЭТ-бутэлек у вартасць. Пластыкавыя рэчы стануць служыць людзям стагоддзямі, а калі сапсуюцца, іх можна будзе перарабіць у новыя прадметы. Згаданы комплекс будзе складацца з трох частак: драбнення другаснай сыравіны на гранулы, выцягвання іх у матэрыял для 3D-друку і стварэння самога прынтара з вялікай сферай друку. Апошні ўжо спраектаваны, цяпер вырабляюцца дэталі для яго мантажу. Вартасць праекта ў тым, што акрамя відавочнай экалагічнай карысці мэбля будзе ў тры разы таннейшай, чым у сярэднім на рынку.

Інжынеры таксама плануюць зрабіць маленькія 3D-ручкі, якія дазволяць вырашаць дробныя гарадскія і ўласныя праблемы — ад латання расколін да склейвання прадметаў.

Дарэчы, у smARTech не лічаць, што пластык — гэта дрэнна. Яго проста няправільна выкарыстоўваюць. У Беларусі ўсяго толькі 30 працэнтаў ад выробленай тары вяртаецца на перапрацоўчыя заводы. А яшчэ шмат тавараў з пластыку завозіцца да нас з іншых краін. Адна з прычын такой нізкай лічбы — беларусы не сарціруюць адходы. Па самых аптымістычных ацэнках Белстата, толькі кожны чацвёрты суайчыннік збірае іх асобна.

Кірыл прызнаецца: калі работа над праектам пачалася, аказалася, што нешта падобнае ўжо існуе.

Нідэрландскія інжынеры летась абсталявалі мэбляй з перапрацаванага пластыку набярэжную Салонікаў у Грэцыі. Арганізавана ўсё было так, што людзі самі прыносілі сыравіну і канцэпты таго, што хацелі б бачыць у сябе на вуліцы. Прапанова выклікала такі інтарэс, што тысячы ідэй да гэтага часу чакаюць сваёй чаргі, бо прадметы не паспяваюць рабіць.

Адрозненне названага праекта ад беларускага ў тым, што ён атрымаў падтрымку ад еўрапейскіх дзяржаў і вялікі бюджэт. Комплекс выйшаў дарагі, таму што замест 3D-прынтара ў замежжы выкарыстоўваюць маніпулятар. Ён можа не толькі друкаваць, але і збіраць машыны на канвееры, варыць і г. д. Каманда smARTech за кошт таго, што плануе выкарыстоўваць, значна зменшае цану канструкцыі.

З пытаннем, дзе размяшчаць зробленую мэблю, інжынеры звярнуліся да Мінскай урбаністычнай платформы, якая ўлетку будзе перарабляць Кастрычніцкую вуліцу. Там збіраюцца ўстанавіць найдаўжэйшую лавачку ў свеце.

— Цяпер рэкорд належыць Балгарыі — 1111 метраў. Але наша атрымаецца самая доўгая па вызначэнні, таму што яна стане бясконцая. З кожнай тонай перапрацаванага пластыку будзе прырастаць на метр. Спачатку ўсталюем яе на Кастрычніцкай, а потым куды-небудзь завернем, — тлумачыць Кірыл.

Каманда таксама супрацоўнічае з пераможцамі мінулага Social Weekend, якія стварылі вуліцу стрыт-фуду ў Маладзечне. А яшчэ дамовілася з таварыствам уласнікаў аднаго з дамоў у Мінску надрукаваць сёе-тое для іх. Двор адметны тым, што жыхары ў свой час адмовіліся ад устаноўкі кантэйнераў для асобнага збору адходаў. Гэтым праектам распрацоўшчыкі збіраюцца іх пераканаць, што яны памыліліся.

3D-друк таксама адкрывае вялікія магчымасці для інклюзіі і людзей з дадатковымі патрэбамі. Напрыклад, узяць пандусы. Рашэнні, якія цяпер прадстаўлены, не заўсёды зручныя, падыходзяць не кожнаму і дорага каштуюць. Прынтар, які ствараюць інжынеры, дазволіць скласці лёгкую і трывалую канструкцыю, якая задаволіць канкрэтнага чалавека. Акрамя таго, яна можа быць здымная. Скарыстаўшыся пандусам, яго можна будзе пры неабходнасці прыбраць, а потым зноў вярнуць назад.

Ужо дасягнуты і папярэднія дамоўленасці на ўстаноўку розных аб'ектаў з інклюзіўным праектам «ПляжИК» на Мінскім моры. Кірыл кажа, што такіх праектаў шмат, засталося сабраць прынтар і пачаць работу:

— Бачым, што цікавасць да ідэі ёсць, а значыць, мы ідзём у патрэбным кірунку.

**Віталіна БАНДАРОВІЧ.**
**Фота дадзена героем матэрыялу.**

*Рух ад сэрца*

# АДЗІН З АНЁЛАЎ НАДЗЕІ




**...Віталь прыехаў да сваякоў у вёску. Вырашыў схадзіць у грыбы. Заблукаў, пачаў шукаць дарогу дадому і трапіў у балота. Тэлефона з сабой не было... На пошукі зніклага адправіліся валанцёры. Лес быў з мноствам забалочаных участкаў, таму група за дзве гадзіны прайшла толькі 500 метраў. На шчасце, Віталь быў знойдзены...**

Мы жывём у патоку мітусні, усе занятыя сваімі справамі, у кожнага ўласныя праблемы. Але ўсё ж ёсць тыя, хто не праходзіць міма чужой бяды і гатовы прыйсці на дапамогу. Адзін з такіх — 28-гадовы кіроўца з Маладзечна Максім Федаровіч, каардынатар *пошукава-выратавальнага атрада «Анёл Паўночны Захад»*. У сваёй дзейнасці атрад не замяняе міліцыю ці МНС, а садзейнічае ўпаўнаважаным дзяржаўным органам.



Тры гады таму Максім разам з тысячамі іншых добраахвотнікаў адправіўся на пошукі дзесяцігадовага хлопчыка, які прапаў у Белавежскай пушчы.

— Мяне зацягнула, і я вырашыў застацца ў атрадзе. Уступіць у яго падштурхнула жаданне дапамагаць людзям і даказаць, што наша грамадства яшчэ здольнае на добрыя ўчынкі, — успамінае суразмоўнік.

Звесткі пра зніклых атрад атрымлівае ад іх сваякоў ці на



сваім сайце. У залежнасці ад сітуацыі пошук можа быць розны: распаўсюджванне інфармацыі ў інтэрнэце, расклейка арыенціровак, тэлефанаванне ў бальніцы і іншыя месцы, куды маглі даставіць чалавека. Але часцей за ўсё члены атрада выязджаюць менавіта на пошукі. Выпадкі таксама розныя: грыбнік, які заблукаў; дзіця, што гуляла на вуліцы і знікла; пажылыя людзі са стратай памяці або іншымі захворваннямі; псіхічна нездаровыя.

— Часта ўсё адбываецца ў цёмны час сутак. Як ні дзіўна, ночу ў лесе ў пэўным сэнсе арыентавацца лягчэй, чым днём у горадзе. Бо ў апошнім выпадку ты шукаеш сярод тысяч, а ва ўгоддзях — толькі аднаго, — працягвае Максім.

Два разы на год праводзяцца маштабныя вучэнні, на якіх добраахвотнікі адпрацоўваюць методыкі пошуку, вучаць новых валанцёраў. Асаблівая ўвага ў гэты час адводзіцца курсу медыцынскай падрыхтоўкі.

Удзельнікам атрада можа стаць любы, хто дасягнуў 18 гадоў, — галоўнае, каб не было праблем са здароўем. Бо для пошуку патрэбныя вытрымка і сілы: бывае, за ноч даводзіцца праходзіць па лесе кіламетраў дваццаць, і не па сцяжынках, а, як той казаў, напралом.

Па словах суразмоўніка, людзі прыходзяць, спрабуюць і сыходзяць, затрымліваюцца адзінкі. Дзяўчаты складаюць палову ад усіх валанцёраў. Толькі не ўсе з іх выязджаюць на пошукі, у іх задача іншая: тэлефанаваць у бальніцы, апрацоўваць інфармацыю, атрыманую ад сведкаў, рабіць арыенціроўкі, апрацоўваючы карты мясцовасці.

Як паведаміў Максім, у краіне каля 150 валанцёраў, якія пастаянна выязджаюць на пошукі. Усе яны рознага полу, узросту, прафесіі. Але аб'ядноўвае іх дапамога незнаёмым людзям. У маладзечанскім атрадзе — шэсць чалавек. «Ён для нас як вялікая дружная сям'я. Мы заўсёды віншуем адно аднаго з днём нараджэння, з іншымі святамі, выязджаем адпачываць на прыроду».

— Дайце некалькі парад, як паводзіць сябе, калі ты згубіўся.

— Разгледзім выпадак у лесе. З сабой неабходна ўзяць ваду, ежу, запальніцу, зараджаны сотавы тэлефон, лекі, калі вы іх увесь час прымаеце. Не лішні будзе смецевы пакет на 120 літраў: у выпадку непагадзі яго можна выкарыстоўваць як дажджавік, а калі давядзецца заначаваць, то як спальнік. Адзенне павінна быць зручнае, свабоднае і яркае. Камуфляж лепш не выкарыстоўваць, бо ў ім вы становіцеся менш прыкметныя.

Калі заблукалі, паспрабуйце адшукаць лінейны арыенцір (рака, дарога, лініі электраперадачы, чыгуначныя пуці) і рухацца ўздоўж яго. Абавязкова паведаміце пра здарэнне па тэлефоне родным ці ў МНС, або на кароткі нумар 7733. Эканомце зарад батарэі і свае сілы, бо пошукі патрабуюць часу. І, вядома ж, пачуўшы крыкі ратавальнікаў, адгукайцеся, свістайце, шуміце, каб вас было чуваць. Самае галоўнае: збіраючыся ў лес, неабходна паведаміць родным, куды накіроўваецеся і ў які час плануеце вярнуцца. Ад падобных простых правілаў залежыць ваша жыццё. Будзьце асцярожныя і беражыце сябе.

**Кацярына АКУШКА, вучаніца 11 класа СШ № 2 г. Маладзечна.**
**Фота з архіва Максіма Федаровіча.**

## Пуховичский районный исполнительный комитет проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь, который состоится 6 марта 2020 г. в 15.00 в зале заседаний райисполкома, расположенном по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, 2-й этаж, к. 227.

На аукцион будут выставлены:

**Лот № 1** земельный участок (кадастровый номер 624450100001003868), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Васильковая, 3, площадь – 0,1000 га, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, начальная цена – 20 570,00 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 2 057,00 рубля.

Расходы, связанные с организацией аукциона – 1802,80 рубля.

Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

Имеется возможность электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения.

Имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с расположением его части площадью 0,0051 га в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт.

**Лот № 2** земельный участок (кадастровый номер 624484800012000115), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Пережирский с/с, СТ «Надежда-96», 22, площадь – 0,1000 га, для ведения коллективного садоводства в садоводческом товариществе «Надежда-96», начальная цена – 1360,00 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 136,00 рубля.

Расходы, связанные с организацией аукциона – 1136,14 рубля.

Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

**Лот № 3** земельный участок (кадастровый номер 624483400003000357), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Дукорский с/с, СТ «Заречный-05», 287, площадь – 0,0598 га, для ведения коллективного садоводства в садоводческом товариществе «Заречный-05», начальная цена – 1883,70 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 188,37 рубля.

Расходы, связанные с организацией аукциона – 1694,75 рубля.

Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

Имеется возможность электроснабжения.

Имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне реки Свислочь, а также его части площадью 0,0059 га в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт.

**Лот № 4** земельный участок (кадастровый номер 624484800018000280), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Пережирский с/с, СТ «Спутник-86», 28, площадь – 0,0645 га, для ведения коллективного садоводства в садоводческом товариществе «Спутник-86», начальная цена – 1322,25 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 132,23 рубля.

Расходы, связанные с организацией аукциона – 1415,65 рубля.

Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

Имеется возможность электроснабжения.

Имеются ограничения в использовании земельного участка в связи расположением его части площадью 0,0072 га в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт.

Желающим участвовать в аукционе необходимо внести соответствующий размер задатка на р/с № BY80AKBB36006250000250000000. Получатель: главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области Минского управления открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» г. Минска, код банка AKBBBY2X, УНН 600537220, код платежа – 04901 (частная собственность).

**Участники аукциона должны представить следующие документы:**

– заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

– заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

**Кроме того, представляются:**

– гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

– представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, Пуховичский райисполком, 2-й этаж, к. 220 со 2 марта по 6 марта 2020 года, с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.

Заключительная регистрация – с 14.30 до 14.55 в день проведения аукциона по адресу: Минская обл., г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, 2-й этаж, к. 227, зал заседаний райисполкома.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победитель аукциона вносит плату за землю; возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и государственной регистрацией в отношении земельного участка, а также, в случае приобретения участка для строительства и обслуживания жилого дома, получает разрешение на проведение проектно-изыскательских работ, разрабатывает и утверждает строительный проект на строительство жилого дома в срок, не превышающий два года.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, выставленными на аукцион, путем выезда на место нахождения участка.

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, к. 220, контактный тел. 8 01713 35879 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Продавец** – ОАО «ОРС Гомель».
Оператор – «Единая система электронных торгов» torgi.gov.by

**Предмет электронных торгов и его месторасположение**

**Лот № 1. Капитальное строение** – здание магазина № 88, инв. номер 320/С-26581, общая площадь 288,5 кв. м, 1967 г. п., расположенное по адресу: г. Жлобин, ул. Ленинградская, 14 (магазин № 88).
Назначение – здание специализированное розничной торговли.
**Лоту принадлежит оборудование:** настенный кондиционер сплит-система, марки CV-24 HAS/AV, инв. № 080034.
Информация о земельном участке: кадастровый номер 340800000001000065, площадь 0,0766 га (право постоянного пользования), назначение – строительство и обслуживание магазина № 88.
**Начальная стоимость с НДС 20 % – 132 883,24 бел. руб.**
**Сумма задатка в размере 10 % от начальной стоимости**

**Лот № 2. Капитальное строение** – здание магазина № 87, инв. номер 310/С-23744, общая площадь 68,2 кв. м, 1963 г. п., расположенное по адресу: Гомельский р/н., д. Березки, ул. Первомайская, 77а.
Назначение – здание специализированное розничной торговли.
Согласно техническому паспорту зданию принадлежит:
**сарай,** инв. № 4100252; **дощатая уборная,** инв. номер № 4100251; **забор дощатый сплошной,** инв. № 1068726; **забор дощатый решетчатый,** инв. № 1068727; **ворота металлические,** инв. № 1068754; **навес кирпичный,** инв. № 1068756.
**Лоту принадлежит оборудование:**
система охранной сигнализации, инв. № 346257.
Информация о земельном участке: кадастровый номер 321089200601000313, площадь 0,0405 га (право постоянного пользования), назначение – для размещения объектов розничной торговли.
**Начальная стоимость с НДС 20 % – 13 517,47 бел. руб.**
**Сумма задатка в размере 10 % от начальной стоимости**

**Лот № 3**. **Капитальное строение** – здание павильона, инв. номер по ЕГРНИ 350/С-76177, общая площадь 150,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Полесская, 37.
Назначение – здание специализированное розничной торговли.
Согласно техническому паспорту зданию принадлежит: **пристройка к магазину,** инв. № 100320, **тамбур,** инв. № 10024, **сарай дощатый 1,** инв. № 00330, **дощатая уборная,** № 10034, **забор дощатый** на деревянных столбах, инв. № 10035, **ворота металлические** на метал. столбах, **калитка металлическая** на метал. столбах.
**Лоту принадлежит оборудование:**
кондиционер марки Galanz CU 36 HRST/AU, инв. № 41547, котел отопительный Junkers ZW 14-2DH AE23, инв. № 49401, телевизионная система видеонаблюдения аналоговая, инв. № 346173, телевизионная система видеонаблюдения аналоговая, инв. № 346302.
Информация о земельном участке: кадастровый номер 340100000001001843, площадь 0,0449 га (право постоянного пользования), назначение – для размещения объектов розничной торговли.
**Начальная стоимость с НДС 20 % – 150 021,41 бел. руб.**
**Сумма задатка в размере 10 % от начальной стоимости**

**1. Электронные торги состоятся 28.02.2020 на электронной торговой площадке оператора torgi.gov.by**.
2. Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Единая система электронных торгов», размещенным на сайте: torgi.gov.by
3. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, аккредитованное на электронной торговой площадке, подает оператору электронной торговой площадки заявление и документ, подтверждающий внесение суммы задатка.
4. Последний день подачи заявлений – 27.02.2020.
5. Шаг аукциона – 5 % от начальной цены предмета торгов.
6. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан перечислить на расчетный счет Продавца сумму фактических затрат согласно прейскуранту торговой площадки в течение пяти календарных дней со дня проведения торгов.
7. После совершения победителем торгов (претендентом на покупку) названных действий и представления организатору копий платежных документов, но не позднее десяти рабочих дней, с победителем электронных торгов (претендентом на покупку) в установленном порядке в соответствии с условиями торгов с продавцом заключается договор купли-продажи имущества.
8. Подробную информацию о порядке, условиях проведения электронных торгов, предмете торгов можно получить по тел. +37529 6672143

## Извещение о проведении аукциона по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| Номер лота Местонахождение земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Срок аренды | Начальная цена. руб. | Расходы по формированию земельного участка, руб. | Сумма задатка | Целевое назначение земельного участка | Ограничения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1 РИЗ «Аэропорт» к. п. Нарочь, У-№ 5** | **0,1354** | **624056300001000430** | **99 лет** | **10 000** | **1783,89 + 297,60 (расходы на объявление в СМИ)** | **1000** | **Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома** (для размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) с объектами обслуживания) | **Нет** |

| | |
|---|---|
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона** | В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона не состоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации;<br>в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);<br>произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта |
| **Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений** | ЛОТ № 1 электрические сети, центральное водоснабжение, центральное водоотведение; |
| **Порядок осмотра земельного участка на местности** | В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| **Условия проведения аукциона** | Наличие не менее двух участников |
| **Продавец** | Нарочский сельский исполнительный комитет |
| **Организатор аукциона** | Нарочский сельский исполнительный комитет |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для юридического лица – копия свидетельства о государственной регистрации. Сумма задатка: 10 % от начальной цены на р/с BY61AKBB36006230819030000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 600537220. Получатель платежа: главное управление МФ РБ по Минской области, код платежа 04002 |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | 28 февраля 2020 г., до 17.00, аг. Нарочь, ул. Первомайская, д. 49 (каб. 3).<br>Контактные телефоны: (8-01797) 46153; 46710 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | 3 марта 2020 г. в 11.00, аг. Нарочь, ул. Первомайская, д. 49 (зал заседаний)<br>Нарочский сельский исполнительный комитет |
| **Дополнительно** | О возмещении затрат в соответствии с постановлением Совета Министров РБ от 01.04.2014 г. № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в т. ч. проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» – возмещение не требуется |

В объявление о проведении аукциона, объявленное Бобовичским сельским исполнительным комитетом, размещенное в газете «Звязда», № 8 от 15 января 2020 года, внести изменения следующего содержания: начальная цена земельного участка № 224, ул. Садовая, аг. Бобовичи, Бобовичский с/с, Гомельского района, кадастровый номер 321080800601001035, составляет 6339,65 белорусского рубля.

УНП 400178403

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18 |

**Предмет аукциона** (имущество реализуется одним лотом).
**Месторасположение:** Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Старино

**Производственная база: цех деревообработки с административными помещениями** (615/С-35497, 1027,1 кв. м), в т. ч. вент. камеры 2 шт., рампа 2 шт., сети питьев. водопровода 184,7 м; сети быт. (255,7 м) и ливн. (287,4 м) канализации, очистные сооружения, двухкамер. септик, поля фильтрации 235 м, покрытия 6446 кв. м; **склад** (615/С-35853, 150,6 кв. м); **КПП** (615/С-35856, 7,6 кв. м), в т. ч. ограждение 639,7 м; **ТП** (615/С-245, 68,3 кв. м); **водозаборная скважина** 615/С-35855), в т. ч. насос Grundfos; **насосная станция** (615/С-35496, 25,2 кв. м), в т. ч. 2 резервуара 150 куб. м, сети пожар. водопровода 484,3 м; **иное имущество:** сети электроснабжения и оборудование (в соответствии с перечнем, размещенным на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Сведения о земельном участке**: пл. **2,5727 га,** предоставлен на праве аренды по 20.11.2115 для обслуживания цеха деревообработки с административно-быт. помещениями, зданий и сооружений. Ограничения – находится в охран. зонах электрич. сетей свыше 1000 В, пл. 0,2 га

**Начальная цена с НДС – 390 386 руб. 07 коп.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** 60 % от цены продажи имущества с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачиваются в течение 10 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 месяцев

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 19.11.2019**

**Аукцион состоится 27.02.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 25.02.2020 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8044-704-92-06, **www.cpo.by**

*Не прапусці!*

## Напішы пра свет, у якім жывём

**У лютым—красавіку пад эгідай Сусветнага паштовага саюза пройдзе XXIV Беларускі маладзёжны конкурс сачыненняў эпісталярнага жанру.**

Да ўдзелу ў ім запрашаюцца навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, не старэйшыя за 15 гадоў. Тэма сачынення — «Напішыце паведамленне (пасланне, ліст) дарасламу пра свет, у якім мы жывём». Аб'ём тэксту — не больш за 800 слоў. Сачыненне пішацца ад рукі на рускай або беларускай мове. Дапускаецца выкарыстанне ў тэксце ілюстрацый удзельніка.

Конкурс праводзіцца ў два этапы:

Першы этап — абласны (прадстаўленне конкурсных работ з 1 лютага да 10 сакавіка 2020 года).

Другі этап — рэспубліканскі (вызначэнне пераможцаў конкурсу да 12 красавіка 2020 года).

На ўсіх этапах конкурсу не падлягаюць разгляду сачыненні, падрыхтаваныя з парушэннем патрабаванняў да іх афармлення або з парушэннем тэрмінаў прадстаўлення.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 03.03.2020 открытого аукциона**

**Лот № 1: капитальное строение с инв. № 700/С-9513 – административно-бытовой корпус**, площадь – 1741,2 кв. м. Составные части и принадлежности: трехэтажное каменное здание административно-бытового корпуса с подвалом, теплоузлом. КПП, асфальтобетонным покрытием, покрытием из тротуарной плитки. **Капитальное строение с инв. № 700/С-102208 – водопроводная сеть,** протяженность 414,8 м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-102207 – тепловая сеть,** протяженность 305,6 м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-102209 – электрические сети,** протяженность 891,5 м. **Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-107589 – канализационная сеть**, протяженность 37,2 м. Лот № 1 расположен по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Челюскинцев, 172. Сведения о земельных участках: кадастровый номер 740100000003001170 (площадь – 0,0020 га, право постоянного пользования, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания административных и производственных зданий), кадастровый номер 740100000003001182 (площадь – 0,5434 га, право постоянного пользования, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания административно-бытового корпуса), кадастровый номер 740100000003007119 (присвоен предварительно).
**Начальная цена продажи с учетом НДС: 483 144,00 бел. руб.** Сумма задатка: 48 314,40 бел. руб.

**Аукцион состоится 3 марта 2020 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 02.03.2020 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30 и с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для перечисления задатка:** получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Могилевоблавтотранс», УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона, в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

**Организатор аукциона**: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Дополнительную информацию можно получить **по тел.: +375222 72-41-14, +37529 624-26-25, на сайте ino.by**

Уважаемые акционеры ОАО Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»!

10 марта 2020 г. в 14.00 состоится очередное общее собрание акционеров с повесткой дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год и основных направлениях деятельности Общества в 2020 году.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности общества за 2019 год.
3. Отчет наблюдательного совета.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2019 год.
5. Утверждение распределения чистой прибыли и выплате дивидендов за 2019 год.
6. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2020 году.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Утверждение условий материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Форма проведения собрания – очная.

Место проведения – по месту нахождения Общества: г. Гомель, ул. Лещинская, 49.

Время регистрации участников собрания в день проведения собрания – с 13.30 до 14.00. При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера дополнительно – доверенность).

Время и место ознакомления акционерами с материалами по вопросам повестки дня собрания – в рабочие дни, начиная с 17 февраля 2020 года по месту нахождения Общества с 13.00 до 16.00, в день проведения собрания – по месту проведения собрания с 11.00. до 13.00.

Формирование реестра акционеров – 10 февраля 2020 года.

Список лиц владельцев ценных бумаг для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 10 февраля 2020 года.

Справки по телефону: 8 (0232) 441017.

УНП 400078768

Информация о формировании реестра владельцев ценных бумаг

Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс», находящееся по адресу: Республика Беларусь, г. Гомель, ул. Лещинская, 49, на основании решения наблюдательного совета от 27.01.2020 года для проведения очередного общего собрания акционеров определило дату сбора реестра акционеров – 10 февраля 2020 года.

УНП 400078768

*Друкуецца ў «Маладосці»*

**Вольга РОПАТ**

# ЧЫРВОНА-ЖОЎТЫ GLASS

*(Урывак)*



**Аўтарка гэтага апавядання калекцыянуе водары, адценні, эмоцыі, вобразы і вобразныя сродкі. Любіць мастацтва і вельмі назіральная. З такімі людзьмі часам адбываецца неверагоднае.**

...Мне падабаюцца твары механізмаў. Калі выпадковая штука глядзіць двума балтамі і адтулінай. Падабаюцца і «індустрыяльныя пейзажы». У іх ёсць нейкае метафізічнае жыццё.

— А што для цябе самае цяжкае ў творчым працэсе?

— Самае цяжкае?.. Нават не эскіз рабіць. Той перыяд, калі пачынаю пісаць і трэба вызначыць, якога колеру будуць дэталі. Гэта нагадвае матэматычны рэбус. Ці штосьці хаатычнае, што можна прывесці да парадку. Трэба ўсё ўзважваць. Насамрэч у жывапісе багата матэматыкі. Шмат рацыянальнага.

Цямнела. Пачалі запальвацца ліхтары. Праспект Незалежнасці ажывіўся. У вокнах насупраць хтосьці стаяў за мальбертам. Калі паглядаеш на цені, на туманна-аранжавае святло ад лямпы або шэра-блакітнае ад тэлевізара, то ўнутры штосьці замірае, заціхае ў прадчуванні дзеі. Таму вокны — звычайнае шкло з рамай (сумую па драўляных жоўтых, зялёных, блакітных рамах, але гэта — асобная гісторыя) — быццам даюць дазвол на прагляд шматсерыйкі і адначасова служаць мяжой паміж знешняй цікаўнасцю і побытавай інтымнасцю. У майстэрні знаёмага мастака было крыху змрочна. Ён запаліў лямпу на адной металічнай назе, і тая, быццам пражэктар у тэатры, выпадкова кінула рабінавае святло на персанажа ў серабрыста-шэрым паліто.

Мастак уключыў музыку. Маленькую майстэрню захапілі ў палон электронныя гукі «Little 15». Я сядзела на канапе. Мой знаёмы сеў за стол, на якім валяліся металічныя дэталькі. Іншы раз здаецца, што хаосу не існуе, толькі своеасаблівы парадак, але не музейны. Я разглядала карціны, ён перабіраў «штучкі». Нас аб'ядноўвалі прастора, музыка і меланхалічнасць. А можа, настальгія?.. Майстэрню агарнула цёплая адзінота, бязважкасць, бясчассе. Нагадвала вось што: калі нічога не адбываецца, проста паглядаеш у акно ці п'еш гарбату, каву, і табе хораша (проста хораша! Калі такое з намі здараецца?..), адчуваеш ціхае шчасце, спакой і не хочацца рухацца, хочацца расцягнуць гэтае імгненне... І чаму яно такое крохкае і хуткае?..

Лямпа спрабавала зрабіць майстэрню ўтульнай, але «Little 15», металічныя дэталькі і персанаж у серабрыстым нібыта па нябачных кубіках разбіралі паветра майстэрні.

Углядалася ў карціну. Персанаж у шэра-серабрыстым паліто падміргнуў. Падміргнуў? Не, не можа быць.

— А яшчэ якая музыка ў цябе ёсць?

— У мяне яе багата. Ёсць класічная, ёсць электронная... Столькі пераслухаў!

— Уключыш што-небудзь з любімага? — з захапленнем спытала я.

Ён перабіраў Рахманінава, Шастаковіча, Шонберга, Вагнера... Падбіраў тое, што змагло б дапоўніць наш настрой — абыякавы, настальгічна-меланхалічны, з таемнай радасцю і яшчэ з чымсьці. Музыка запоўніла б майстэрню і пры гэтым не перашкаджала б нашым думкам або ўспамінам… Але мы проста сядзелі ды маўчалі. Сувязь між намі, аднак, не знікала.

Зноў паглядзела на карціну. З яе вырваўся дым. Люлька выдыхала яго ў майстэрню. Мужчына ў капелюшы зноў падміргнуў. Гэтым разам не здалося. Дрыжыкі ахапілі мяне. Лёгкі халадок прабегся, сціснуў і адпусціў.

— Выбраў?

— Не яшчэ.

Зноў кінула позірк на карціну. Дзе ён? Персанажа ў шэра-серабрыстым паліто не было. Паглядзела на мастака, а затым яшчэ раз на карціну. Не было! Унутры замерла.

— Паглядзі на карціну... Ты бачыш героя з люлькай, праўда?

Шэра-блакітныя вочы спыніліся на карціне.

— Не, не бачу. Не здзіўляйся. Такое ўжо здаралася. Нагуляецца і прыйдзе.

У галаве ўсё зблыталася. «Што ўвогуле здарылася?», «Чаму ён збягае?», «Як можа герой з карціны выйсці з яе?», «Дзе ён?»...

Абсурд. Падышла «на аўтамаце» да акна (бо заўсёды, калі штосьці трывожыць, падыходжу да яго, нібыта вуліца мне дапаможа). Як сярод іх персанаж будзе жыць?.. Куды пойдзе?..

* * *

Тым часам Персанаж у шэра-серабрыстым паліто спыніўся каля мігатліва-задзірлівай шыльды «Бар», што вісела на трэцім паверсе дома пяцідзясятых гадоў. Чырвона-жоўтыя агеньчыкі заманьвалі, як мужчын (канешне, не ўсіх) заманьваюць чырвоныя лакіраваныя туфелькі. Персанаж паправіў левай рукой капялюш і пачаў караскацца па будынку да шыльды, каб убачыць памяшканне праз каляровае шкло. У арачным акне, у вітражных устаўках ён убачыў жаночы сілуэт і ўзбуджальны адбітак «раБ» на сцяне. Чырвоны шкляны аскепак разліў адценні. Персанаж схаваў люльку ў кішэню паліто, затым адчыніў акно і саскочыў у бар. Жанчына ў чорна-чырвоным ніяк не адрэагавала. Нічога не сказала і афіцыянтка.

Крывава-барвовыя з пераходам у малінавы (у залежнасці ад святла) сцены, круглыя столікі, квадратныя, напісаныя маслам нацюрморты з выцягнутымі вазамі ды кубкамі. Музыка — павольна-працяжная, з сексуальнымі стогнамі жанчын. Гукі не вырываліся, яны былі крыху схаваныя, апрацаваныя, з электронным прысмакам. Чырвоныя сцены ў сваім жыцці шмат што бачылі, і каб здзівіць іх, трэба было яшчэ пастарацца. Увогуле настрой памяшкання нагадваў выраз твару жанчыны з карціны «Абсент» Эдгара Дэга — разгубленасць, безвыходнасць і беспрасветная будучыня.

Персанаж павольна, ціхімі крокамі накіраваўся да століка, дзе сядзела жанчына ў чырвонай сукенцы з чорнымі квадратамі.

— Можна?

Манокль, ацэньваючы, бліснуў. Цёмна-барвовыя вусны з трэшчынкамі, як скураныя пальчаткі, пацягнуліся да цыгарэты. Выдых.

— Сядайце. Я не супраць.

Персанаж кідаў позіркі то на акенца, якое ўпрыгожваў вітраж, то на жанчыну, найчасцей — на яе твар. Яна зноў зацягнулася цыгарэтай. З цёмнай прорвы вывальваўся дым, зацягваючы, быццам паўпразрыстым вэлюмам, манокль у чорнай апраўе.



— Кім вы працуеце? — спытаў Персанаж і з асцярожнасцю паглядзеў на яе.

Хітра назіраў за Персанажам рубін на пальцы. Мужчына заўважыў, што рукі суразмоўніцы нагадваюць бледныя шчупальцы васьмінога. Але раптам перавёў позірк на твар.

— Калісьці працавала журналістам. Добра разбіраюся ў мастацтве.

Грубы палец паправіў стрыжку, але жэст атрымаўся ненатуральна лёгкім, крыху какетлівы.

— А што вы робіце тут?

— А як вы лічыце?

Яе вочы наліліся падазронасцю, ад чаго павекі крыху набухлі, як цеста.

— Няма ідэй. Што можа рабіць жанчына ў бары/днём/у сераду?..

— Думаць.

У гэтую ж хвіліну афіцыянтка з грудзьмі як духмяныя свежыя булачкі крыкнула:

— Сіў, яшчэ будзеш штонебудзь заказваць?

Жанчына гарызантальна разрэзала паветра двума пальцамі, што азначала «не, хопіць».

— Значыць, вас завуць Сіў... і вы не з Беларусі?.. — быццам разгадаў загадку Персанаж.

— Калі дакладней — Сільвія, але мне больш падабаецца Сіў. Я з Германіі. Але даўно ў Мінску. (Паўза) Вы тут застаяцеся?

— Не. (Паўза) Калі не супраць, можам прайсціся па горадзе.

Празрысты парасон прызямліў іх, і яны скіравалі ў бок Нацыянальнага мастацкага музея.

— Чаму вы пра мяне нічога не пытаецеся? Няўжо вам не цікава? — спытаў Персанаж.

— А навошта? Пра што мне трэба — даведаюся.

— Шкада... Мне так хочацца вам столькі ўсяго расказаць! Столькі гісторый! Вы знаёмыя з Шагалам?

— Калісьці бачыліся.

— Зойдзем у Нацыянальны мастацкі? Хачу вас бліжэй пазнаёміць...

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
30 01 2020 г.

SEX-БАЛЯСЫ

# ВЕР. АЛЕ ПРАВЕР?

**Нядаўна прыйшла навіна, што 36-гадовы бразілец Радрыга Алвес, больш вядомы як «жывы Кен», хоча стаць... жанчынай *(на здымку)*. Мужчына ў свой час зрабіў мноства аперацый, каб наблізіць цела да ідэальных параметраў. Ну як ідэальных? Да такіх, якімі яны яму бачыліся, — ялечных. («Падцяжка твару — гэта маладосць, прыцягнутая за вушы».)**

**А потым надумаў зрабіць яшчэ адну аперацыю, гэтым разам — па змене полу. Як пішуць, мужчыну аказаўся блізкэйшы вобраз не Кена, а яго сяброўкі Барбі. («— Навошта вы хочаце змяніць пол? — Хачу выйсці на пенсію ў 58, а то, думаю, да 63 не дажыву».) Аказваецца, гэтая трансфармацыя намецілася яшчэ ў дзяцінстве, шоўмен доўга хаваў свае жаданні ад родных і сяброў. («Маленькі хлопчык прызвычаіўся бачыць маці ў джынсах. І раптам яна надзела сукенку. Дзіця ў шоку: — Мама, дык ты дзяўчынка?») А цяпер нарэшце знайшоў гармонію са сваім унутраным светам — блізкія людзі падтрымалі Радрыга.**

Ранейшы Кен прымае гармоны для змены полу і носіць станік памеру D. («Ролевыя гульні скончыліся скандалам, нават не пачаўшыся. Муж пераадзеўся доктарам і спытаў: «Дыетолага выклікалі?») Напярэдадзе яго чакае аперацыя на твары, павелічэнне бюсту і «пятай кропкі», а ўжо потым — змена полу. Сам Алвес спадзяецца, што людзі прымуць новае аблічча. Як думаеце, атрымаецца з яго гэткая «маці Сціфлера»? (Хто памятае «Амерыканскі пірог»?) Зрэшты, нам што да таго? Пераказаў гэтую гісторыю выключна з адной мэтай. Чалавек прынамсі нічога не стаў хаваць, расказаў праўду. («— Я стамілася быць моцнай, стамілася дараваць, хачу быць проста жанчынай: слабай і каханай. — Хлопцы кажуць, ты цыгарэты аб язык тушыш?») А то, ведаеце, бывае...

Жыхар Алжыра абвінаваціў жонку ў махлярстве і запатрабаваў кампенсацыю за маральную траўму і душэўныя пакуты, якія адчуў, калі ўпершыню ўбачыў яе... без макіяжу. («У мужчын і жанчын адны і тыя ж дзеянні вельмі часта маюць зусім процілеглы эфект. Вось, напрыклад, мужчына, калі ён умываецца, робіцца прыгожы...») Бяда прыйшла, як той казаў, калі не чакалі — ранкам пасля першай шлюбнай ночы. Шакіраваны мужчына даказваў потым у судзе, што да замужжа нявеста ўвяла яго ў зман майстэрскім макіяжам, які рабіў яе прыцягальнай. Калі жанчына змыла з сябе касметыку, яго ахапіў жах ад маштабаў трагедыі. («— Колькі гадоў вы мне дасце? — спытала мужчыну жанчына. — Па колеры вуснаў — 17, па выгібу бровак — 16, па колеры твару — 20. Атрымліваецца 53».) Пакрыўджаны да глыбіні душы муж выкацiў жонцы (ужо былой?) іск на 15 тысяч еўра.

А бывае яшчэ горш. Імам Мухамад Мутумба з Уганды выпадкова ажаніўся з... мужчынам. Са спасылкай на тамтэйшы партал New Vision паведамляецца, што праз два тыдні пасля вяселля высветлілася, што абранніца імама Шабула Набукіра насамрэч махляр Рычар Тумушабе. Як вам сюжэт? Пішуць, што Мутумба пазнаёміўся з аферыстам, пераадзетым у жанчыну. («У конкурсе «Міс Бюст» перамагла дзяўчына, твар якой так і застаўся невядомы».) Згулялі вяселле, а пасля «нявеста» два тыдні адмаўлялася ад інтымных стасункаў, нават не раздзявалася на ноч. Маўляў, напачатку трэба пазнаёміцца з бацькамі мужа. («— Як у вас, жанчын, усё складана. — Не складана! У нас проста ўсё няпроста. — І я ж пра тое. Вам усё ускладніць — працай простага».) Дарэчы, перад вяселлем імам наведаў у вёсцы цётку «абранніцы» з выкупам — двума мяхамі цукру, дзвюма казамі, адзеннем. («Працуеце, няўдачнікі? А мне прынц Нігерыі пакінуў у спадчыну 34 мільярды. Зараз пераведу дзве тысячы долараў за афармленне і чаа-какава, няўдачнікі!») Тумушабе хаваў сваю знешнасць пры дапамозе хіджаба, накладных грудзяў, касметыкі і імітацыі жаночага голасу. Падман раскрыўся пасля таго, як «жонку імама» западозрылі ў крадзяжы: пад покрывам ночы Тумушабе залез да суседа. («— Як у цябе справы з тваёй новай дзяўчынай? — Рассталіся. — А што так? — Яе запыты не супалі з маёй шчодрасцю».) Несапраўдная была і «цётка» махляра, якая атрымала выкуп за «нявесту». Цікава, а колькі б гэтая гісторыя яшчэ магла працягвацца, каб не той крадзеж?



Пасля такіх здарэнняў трохі інакш можна пачаць ставіцца да праверак на вернасць. («Тэлефаную ёй і гавару: маўляў, так і так, дарагая, мой бізнес накрыўся... Прыязджаю на кватэру, а яе ўжо і след прастыў, і шмоткі забрала. Ну і пайшла сабе! Навошта мне баба без пачуцця гумару?») Памятаеце гісторыю пра тое, як мільянер абвясціў узнагароду за спакушэнне сваёй нявесты? Ананімны карыстальнік звярнуўся ў інтэрнэт-краму Hush Hush па продажы прадметаў раскошы з просьбай падшукаць палюбоўніка для яе. Нешта ў паводзінах абранніцы яму падалося падазроным. («Канешне, я ведаў, што яна замужам, але навошта было цягнуць на спатканне мужа?») Каб пазбавіцца ад сумненняў, мільянер спрабаваў наняць маладога прывабнага мужчыну, які б мог зрабіць уражанне заможнага чалавека. («— Мама, а ты хутка з работы вернешся? Я засумавала. — Не паспееце, буду праз пяць хвілін. Прывітанне Сярожу!») Не чулі, чым там усё скончылася? Хоць, канешне, да такога лепш не даводзіць... («— Дарагі, ты мяне кахаеш? — Так. — А як? — Як ні дзіўна».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Альбо стабільная работа, альбо літаратура»




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Ці могуць фестывалі або конкурсы дапамагчы маладому аўтару? Ці ўплываюць яны на цікавасць тэатраў да п'ес і ў выніку — на іх увасабленне на сцэне?***

— Вядома, гэта дужа значная прыступка, асабліва для пачаткоўца. Цяпер фестываляў вельмі шмат: гаворка нават не пра дзясяткі, а пра сотні, калі мы бяром пад увагу не толькі беларускія, але і рускамоўныя. У гэтым агульным масіве п'ес ёсць шанц заявіць пра сябе. Як тое зрабіць? У мяне няма знаёмстваў, няма сяброў-заступнікаў... Калі напісала п'есу, стала думаць, што далей. У тэатр прыйсці проста так я не магла. Мне здаецца, гэта крыху некарэктна, бо я ж не ведаю, ці добра атрымалася. Зразумела, што кожны пісьменнік лічыць свой твор геніяльным, але мне патрэбна была ацэнка з боку — ад людзей, у якіх ёсць экспертнае меркаванне, якія маюць вялікі досвед. Вядома, было вельмі страшна адпраўляць п'есу на фестывалі, але першая перамога стала моцным штуршком, каб рухацца наперад. Гэта свайго роду паказчык, што твор атрымаўся добры і з ім можна працаваць.

Супрацоўніцтва з Маладзёжным тэатрам дало мне новы досвед. Першапачатковая п'еса, якая выйграла конкурс, была трохактавая. І ў яе быў іншы фінал. Мы шмат працавалі з рэжысёрам Андрэем Гузіем, з артыстамі, у якіх былі свае пажаданні да драматургічнага матэрыялу. У выніку твор, які ўвасоблены на сцэне, стаў прыкладна ў паўтара раза карацейшы за арыгінал. Тым, хто ведае абодва варыянты, больш падабаецца версія, падрыхтаваная для Маладзёжнага тэатра. Асабліва канцоўка. Таму што ў першым варыянце Трыксцер сыходзіў, а ўсім хацелася, каб ён застаўся. Гэта значыць, што персанаж знайшоў гледача.

***— Ці адпавядае сцэнічнае ўвасабленне герояў таму адчуванню, якое вы ўкладвалі ў вобразы пры напісанні п'есы?***

— Калі параўноўваць першы варыянт твора і тое, як ён быў пастаўлены ў тэатры, то не супала нічога. Абсалютна! У першым варыянце Псіхолаг і Трыксцер — адзін чалавек. Але разам з рэжысёрам Андрэем Эдуардавічам мы прыйшлі да высновы, што гэта будзе не відовішчна. Цікавей, калі прысутнічаюць два розныя персанажы. З роляй Трыксцера бліскуча справіўся Андрэй Гладкі, якім заслужана захапляюцца ўсе. Калі я ўбачыла, як ён увасобіў свайго героя, адчула прыемны шок — наогул была іскрыстая прэм'ера. Вельмі спадабалася, як сыграў Юрый Шаланкоў. Для мяне Псіхолаг быў усё-такі больш сур'ёзны, можа быць крыху «нудотны». З пункту гледжання гледача персанаж Шаланкова атрымаўся лёгкім, вельмі лагодным. Яго любяць, хочуць абараніць. Актрысы Кацярына Раманнікава і Оля Давыдава-Роік зрабілі сваіх гераінь жывымі і вельмі блізкімі людзям. Жанчыны і дзяўчаты рознага ўзросту асацыююць сябе з імі, знаходзяць нейкія падобныя моманты ў сваім жыцці. Нешта неверагоднае зрабіў Ігар Вепшкоўскі. Персанаж, якога ён увасабляе, шчыра кажучы, у п'есе слабаваты. Але дзякуючы акцёрскаму майстэрству атрымаўся настолькі яркі, што нават яго з'яўленне на сцэне выклікае выбух смеху ў зале. Хочацца адзначыць ігру Дзяніса Майсейчыка. У маім варыянце журналіст быў больш нахабны, але менш смешны, а ў Дзяніса ён атрымаўся смешным, але без глупства. Я вельмі ўдзячная ўсім акцёрам: у іх вобразы больш яркія і аб'ёмныя, чым я задумвала. Заўсёды на спектаклях сачу за рэакцыяй гледачоў. Ведаю, што некаторыя прыходзілі на іх не адзін раз, і яны ўжо чакалі з'яўлення любімых артыстаў.

Мне здаецца, што ў тэатры важная праца ўсёй каманды, бо дзякуючы ёй п'еса ажывае. Інакш гэта проста тэкст на паперы.

***— Наступныя п'есы вы ствараеце з улікам досведу работы над спектаклем «Трыксцер клуб»?***

— Так, яны пішуцца на яго аснове. Дзякуючы гэтаму творы сталі больш кампактныя, больш насычаныя. Я атрымала вялікую падтрымку ў тэатры і ўжо не баялася спрабаваць сябе ў новых жанрах. Думала: калі аднойчы атрымалася, значыць, і далей можа атрымацца. У мяне з'явіліся манап'еса, дзіцячая п'еса. Некалькі твораў былі прадстаўлены ў фінале чатырох расійскіх буйных драматургічных конкурсаў.

П'еса «А 6-й раніцы, амерыкана» ўвайшла ў спіс дзесяці найлепшых твораў 2019 года па выніках конкурсу «Аўтара на сцэну», арганізаванага Нацыянальнай асацыяцыяй драматургаў (Расія). Я стала першым і пакуль адзіным беларускім драматургам, уганараваным гэтай прэміяй. У падарунак атрымала сертыфікат на пастаноўку ў паўмільёна расійскіх рублёў! Да апошняга не магла паверыць, што сапраўды перамагла і маю п'есу выбралі пры такой канкурэнцыі. Калі паглядзець шорт-ліст, то там можна ўбачыць шмат вядомых драматургаў з вялікім досведам. Але ацэньваюць у выніку п'есу — і больш нічога. «А 6-й раніцы, амерыкана» была напісана адразу пасля прэм'еры «Трыксцер клуба» ў маі, асноўная гісторыя прыдумалася наогул пасля нашых пасядзелак з артыстамі. Спектакль атрымаўся настолькі выдатны, а выканаўцы былі такія мілыя, што мне адчайна захацелася стварыць нешта лепшае і зноў убачыць на сцэне, што атрымаецца.

У конкурсе «Манадрама-2019» я стала лаўрэатам, п'еса «Жыццё на Марсе» ўвайшла ў зборнік, выдадзены Расійскай дзяржаўнай бібліятэкай мастацтваў. Твор «Адна ноч у Стамбуле» стаў пераможцам восеньскага этапу «Час драмы» (Расія). Гэта адзін з самых маштабных конкурсаў, які праходзіць у чатыры этапы — па сезонах года. За год у ім удзельнічае каля 600-700 п'ес з розных краін.

***— А як вы зразумелі, што хочаце пісаць?***

— Рабіць гэта я пачала яшчэ ў малодшай школе, гісторыі складваліся самі сабой. Але атаясамлення сябе з пісьменніцтвам не было, здавалася, што мае фантазіі існуюць асобна, а кнігі — нейкі зусім іншы свет, які ствараюць асаблівыя людзі. Ужо ў студэнцкія гады разабралася, што да чаго, і стала адпраўляць рукапісы па буйных выдавецтвах. Пісала ў розных жанрах, прапаноўвала фэнтэзі і містыку, атрымлівала адмовы. У 2010 годзе вырашыла паспрабаваць сябе ў жанры дэтэктыва, і праз некалькі месяцаў маю кнігу прынялі да публікацыі ў найбуйнейшым расійскім выдавецтве «Эксмо», яна выйшла ў 2011 годзе. Да мяне ў сям'і ніхто не пісаў. Але мама паглядзела на мае спробы пяра, вырашыла, што талент у дзіцяці не мог узнікнуць сам па сабе, напэўна, павінна быць нейкая падстава, — і пачала пісаць сама. Сёння яна — сцэнарыст і пісьменнік (член Саюза пісьменнікаў Беларусі) Ганна Альхоўская.

***— Вы скончылі Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт. Ці атрымліваецца сумяшчаць прафесію з творчасцю, альбо давялося рабіць выбар?***

— Не, сумяшчаць не атрымлівацца. Я паспела папрацаваць перакладчыкам, паспрабавала сябе і ў журналістыцы, але паўтара года таму зразумела, што трэба выбіраць: ці адно, ці другое: альбо стабільную работу, альбо літаратуру. Тады я канчаткова сышла з офіса, хоць было жудасна страшна і рызыкоўна. Але менавіта гэта дазволіла зрабіць тое, чаму многія дзівяцца: напісаць за год даволі шмат п'ес і кніг.

**Вераніка МАЦУКЕВІЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 29.01.2020 г.

# ЗІГЗАГІ ЛЁСУ СЯДЗІБЫ ХРАПТОВІЧАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На пачатку мінулага стагоддзя бібліятэка паводле спрэчнага «завяшчання» аднаго з апошніх гаспадароў была перададзеная ў Кіеўскі універсітэт і мусіла быць вернута на радзіму, калі б у Беларусі зноў адкрыўся і пачаў працаваць свой універсітэт. Аднак гісторыя распарадзілася па-свойму — рэвалюцыя, нацыяналізацыя «панскай уласнасці», Вялікая Айчынная вайна, — таму вярнуць кніжную спадчыну не ўдалося ні ў 1920-я, ні ў 90-я. Пакуль што адзіная рэалізаваная дамоўленасць — электронная копія тытульных лістоў дзвюх тысяч захаваных у Кіеве кніг, арыгіналы ж застаюцца па-за межамі нашай краіны. На сёння ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі выяўлены толькі два асобнікі з вялізнай кніжнай калекцыі, што пацвярджаюць экслібрысы ўладальнікаў. Яшчэ адну кнігу *(на фота)* адшукаў у прыватным зборы беларускі калекцыянер, **краязнавец Дзмітрый Шаўня,** які выкупіў яе і прывёз зноў у Шчорсы.



Таксама часткай маштабнай працы стаў культурна-асветніцкі праект «Вяртанне», прэзентаваны на мінулым тыдні ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і прысвечаны спадчыне графаў Храптовічаў. Ён уключае, у прыватнасці, жывапісныя работы, эцюды і акварэлі, створаныя сучаснымі майстрамі за апошнія шэсць гадоў падчас мастацкіх пленэраў у Шчорсах. Плануецца, што пасля завяршэння экспазіцыі ў Мінску копіі палотнаў пераедуць у сядзібу «Шчорсы», дзе іх змогуць убачыць усе ахвотныя.

## З учора ў сёння

Палацава-паркавы комплекс Храптовічаў — гэта часткова захаваны помнік архітэктуры XVIII стагоддзя ў аграгарадку Шчорсы, за 25 кіламетраў ад Навагрудка. Палац быў узведзены ў 1770—1776 гадах паводле праекта вядомых еўрапейскіх архітэктараў Джузэпе дэ Сака і Якуба Габрыэля і цалкам разбураны ў XX стагоддзі падчас Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Да нашых дзён у парку, дзе расло звыш 200 разнастайных відаў раслін, захаваліся некалькі штучных каскадных сажалак (адну з іх засыпалі пад стадыён) і фрагменты маёнтка: двухпавярховы будынак дома ўпраўляючага (пазней тут размяшчаліся школа, рамеснае вучылішча і сельская бібліятэка), левы флігель (тут доўгі час працаваў дзіцячы садок), карэ службовых корпусаў, вяндлярня, рэшткі кузні і канюшні.

За кіламетр ад палаца ў так званай «мураванцы Храптовіча» размяшчаўся вялікі гаспадарчы двор — па сутнасці, агракамбінат. Тут разводзілі пародзістых кароў, рабілі масла і варылі славутыя сыры, якія потым на сваіх жа карабках везлі па Нёмане ў Літву і Кёнігсберг, пяклі хлеб, рабілі натуральнае ўгнаенне — касцяную муку, выпускалі цэглу і трубы для дрэнажу, на ўрадлівай мясцовай глебе вырошвалі лён, збожжа, разнастайную агародніну. А з графскай вінакурні выходзіла штогод 16 тысяч вёдзер гарэлкі (прычым у яе вытворчасці былі задзейнічаны толькі маладыя нежанатыя хлопцы). Недахопу ў работніках ніколі не было — Храптовічы першыя ў Беларусі адмянілі прыгоннае права ў сваім маёнтку, амаль на стагоддзе раней да яго афіцыйнага скасавання, заснавалі для сялян школу і касу ўзаемадапамогі, а ручную працу дзе толькі магчыма механізавалі. Нездарма сучаснікі сталі ў прыклад іншым землеўласнікам «узорную сельскагаспадарчую культуру».

У савецкі час, згадвае былы сакратар Шчорсаўскага сельвыканкама і мясцовая **краязнаўца Марыя Пaддубіцкая,** у мураванцы размяшчаліся калгасныя склады, была ветлячэбніца, працаваў цэх асфальтавага завода і аж да 1990-га ў службовых кватэрах жылі некаторыя работнікі. Цяпер былы гаспадарчы двор не выкарыстоўваецца. «Але ж так усцешвае, што ў многіх нашых людзей наспела душэўная неабходнасць адрадзіць гэтыя мясціны, у якія проста немагчыма не ўлюбіцца», — разважае Марыя Пятроўна.

## З сёння ў заўтра

Сучасны музей-сядзіба «Шчорсы» — так бы мовіць, асабісты ўнёсак Дзмітрыя Шаўні ў маштабны праект «Вяртанне», мэта якога — пазнаёміць беларусаў са страчанымі нацыянальнымі каштоўнасцямі і творамі мастацтва, што ўваходзілі ў калекцыю Храптовічаў. Яшчэ некалькі гадоў таму калекцыянер набыў напаўразбураны домік і некалькі гаспадарчых пабудоў на тэрыторыі палацава-паркавага комплексу ў Шчорсах, рэканструяваў домік і змясціў на ўваходзе дэвіз з фасада маёнтка Храптовічаў «Мір і свабода», збудаваў альтанку над скляпеннямі XIX стагоддзя, дзе плануе адкрыць музей беларускай наіўкі, сабраў шэраг арт-аб'ектаў і пастараўся вярнуць у наваколле дух мінулай эпохі. З гэтай мэтай ён зладзіў згаданы раней выставачны праект «Вяртанне», правёў у сядзібе ўжо некалькі мастацкіх пленэраў, а таксама адкрыў у Шчорсах пастаянна дзеючую фотавыстаўку, якая дае ўяўленне пра тое, як выглядаў палац Храптовічаў і наваколле да 1937 года, як жылі і чым захапляліся яго апошнія гаспадары. «Мая дзейнасць, пошук кніг і карцін з калекцыі магнатаў, работа ў архівах і бібліятэках — толькі невялічкі ручаёк у вялікай плыні, у дзейнасці многіх людзей, якія працуюць над вяртаннем гісторыка-культурнай спадчыны ў Беларусь, — падкрэслівае Дзмітрый. — Мяне часта пытаюць, на які перыяд разлічаны праект «Вяртанне», калі ён скончыцца — праз год, пяць, дзесяць? Думаю, што ніколі, што гэта справа на ўсё жыццё. Бо кожны год трапляюцца ўсё новыя матэрыялы, падключаюцца новыя людзі, хочацца разам паспець як мага больш і адрадзіць былую веліч палаца Храптовічаў, каб людзі ведалі не толькі Мір і Нясвіж».



Дзмітрый ШАЎНЯ марыць адрадзіць былую славу Шчорсаў.

Балазе, аднадумцаў на гэтым шляху сапраўды нямала. З дапамогай спецыялістаў раённай ЖКГ, валанцёраў і саміх жыхароў Шчорсаў, расказвае **галоўны спецыяліст аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама Наталля ЖЫШКО,** пазалетась і летась удалося добраўпарадкаваць значную частку парку, прыбраць аварыйныя і самасейныя дрэвы, якія разбуралі фундамент і будынкі маёнтка і мураванкі. На чарзе — далейшае добраўпарадкаванне тэрыторыі, рамонт даху вяндлярні, пытанні кансервацыі мураванкі і распрацоўка праекта магчымай рэстаўрацыі і рэканструкцыі палацава-паркавага комплексу, шмат іншай работы. Нашчадкі роду Храптовічаў — унук апошняга ўладальніка Пётр Буцянёў, які жыве ў ЗША, а таксама сваякі з Парыжа і Мілана — дапамаглі з пошукам інфармацыі ў архівах і перадалі ў Беларусь пэўныя дакументы і фотаздымкі. Пэўныя задачы дазваляе вырашыць краўдфандынг, з дапамогай якога актывісты культурна-асветніцкага фонду «Шчорсы і Храптовічы» ладзяць валанцёрскія летнікі і працягваюць добраўпарадкаванне вялізнай — у 32 гектары — тэрыторыі комплексу.

А вось інвестараў, гатовых вырашыць матэрыяльнае пытанне: выкупіць усе будынкі палаца цалкам і аднавіць яго былую веліч, знайсці пакуль што не ўдалося. Аб'ект неаднаразова выстаўляўся на аўкцыён і з кожным разам трацiў у цане; на сёння яго агульны кошт, зніжаны ад першапачатковага на 80 %, складае каля 50 тысяч беларускіх рублёў, але, як сцвярджаюць спецыялісты, укласці ў аднаўленне гістарычнага помніка трэба яшчэ некалькі мільёнаў, а такія выдаткі можа сабе дазволіць хіба толькі буйны бізнес. «І ўсё ж мы вельмі спадзяёмся, што знойдуцца прадпрымальнікі і мецэнаты, якія палюбяць гэта месца і захочуць тут разам з намі працаваць і быць, — кажа Наталля Жышко. — Тым больш, турыстычны паток, асабліва летам, у нас заўжды вялікі — каб палюбавацца месцамі, дзе быў напісаны, на мой погляд, самы шыкоўны твор пра беларускую жанчыну, па сіле духу мацнейшую за Жану Д'Арк, — «Гражына» Адама Міцкевіча, у Шчорсы едуць і беларусы, і замежнікі».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК,**
*Шчорсы — Мінск.*

**Фота БелТА.**

Новыя кнігі

# Рай там, дзе праца ўзвышае чалавека

**Новая серыя выданняў аб унікальных мясцінах нашай краіны — «Зберагчы роднае» — пачала выходзіць на Паліграфічным камбінаце імя Якуба Коласа. Першая ластаўка — «Кветкавы край Беларусі» паэта Леаніда Дранько-Майсюка і фотамайстра, журналіста газеты «Звязда» Анатоля Клешчука.**




Вядомыя паэт і фотамастак аб'ядналіся ў адным клопаце — у жаданні расказаць пра славуты берасцейскі Давыд-Гарадок. «Вось яна, казка — Давыд-Гарадок: / Бацька на ганку і маці ў гародзе, / А перад хатаю чысты грудок — / Сонца стаіць і не хоча заходзіць»... Ва ўступным слове да цыкла эсэ, прысвечаных свайму радзіннаму паселішчу, Леанід Дранько-Майсюк фактычна тлумачыць філасофію, канцэпцыю выдавецкага праекта (дарэчы, кніга складзена, звярстана ў выдавецтве «Бяловагруп»): «...Народжаны ў Давыд-Гарадку (у мястэчку!), па-іншаму я і сказаць не магу. Народжаныя ж у вёсцы, напэўна ж, прамовяць па-свойму: «Няхай сабе ў замках — дух, а душа ўсё-ткі ў вёсках!» — і будуць мець рацыю.

Кожнаму бліжэй сваё, і таму, гаворачы пра беларускае мястэчка як гістарычны цэнтр гандлю і рамяства, я думаю пра ягоную большую музейную, калі хочаце, турыстычную прыцягальнасць.

Ад пачатку свайго мястэчкі належалі каралям і скарбу, багатым прыватным уласнікам і царкве.

Сёння, маючы статус гарадскіх пасёлкаў, а то і вёсак, яны належаць дзяржаве, і дзяржава па прынцыпе аднаўлення замкаў паступова аднаўляе, дае новае жыццё і мястэчкам.

Паглядзіце, як расквітнеў той жа Мір! Хочацца толькі, каб гэты працэс не задоўжваўся, паскараўся.

У местачковай прасторы (і тут няхай гарадскія і вясковыя людзі на мяне не крыўдзяцца!) найбольш выявілася беларуская руплівасць і цягавітасць, узбагачаная прыкметнай суседскай прысутнасцю яўрэйскіх шкляроў і гандляроў, татарскіх агароднікаў і рымараў. Кожнае мястэчка — поле бясконцага клопату!

І карціна гэтага клопату была неабдымная: там, скажам, ткалі палотны, тут — шылі кажухі; у адным куце варылі мыла, у другім — ляпілі гаршкі; недзе выраблялі скуры, а недзе — гартавалі зброю; у гэтым двары гналі алей, а ў тым лесе — дзёгаць...» І далей: « ...Я з фотамайстрам Анатолем Клешчуком склаў альбом пра свой родны Давыд-Гарадок, берагавое мястэчка, людзі якога над ракою Гарынь, у сваіх агародах вырошчваюць кветкі, а ў цяпліцах — раннія агуркі і памідоры; у нядаўнія часы жыхары Давыд-Гарадка рабілі лодкі і шылі прыгожы абутак, гандлявалі марожаным і сырамі...

Давыд-Гарадок ляжыць на паўночным усходзе Столінскага раёна, а наогул жа Столінскі раён — па сутнасці адзінае месца ў Беларусі, дзе знаходзяцца самыя вялікія вёскі — Альшаны, Велямічы, Рубель, Беражное, Вялікая Малешава...

У кожнай з гэтых вёсак жыве па некалькі тысяч жыхароў!..»

Сапраўднай песняй пра Давыд-Гарадок уяўляецца кніга Л. Дранько-Майсюка і А. Клешчука. Высокі ўзровень мастацка-публіцыстычнага, разам з тым выразна адраснага, рэгіёназнаўчага апісання родных мясцін паэтам накладваецца на ілюстрацыйны, эмацыянальны складнік асэнсавання горада, мястэчка, яго ваколіц, рэльефна вымаляваны фотажурналістам, фотапубліцыстам. Фотаздымкі Анатоля Клешчука дапаўняюць рэпрадукцыі старых, архіўных здымкаў, ілюстрацыі розных гістарычных артэфактаў. Пісьменнік зазірае ў даўніну, грунтуючыся на аповедах гарадчукоў, звяртаючыся да розных гісторый, фальклорных згадак, робіць цікавыя высновы. Кніга складаецца з некалькіх раздзелаў — «Давыд Ігаравіч, Бона Сфорца»; «Веснянцтва. Гандаль»; «Цікеткі»; «Лодка»; «Вера»; «Конікі»; «Гарадчук і гарадчанка». У іх прастору, поўную дэталяў з радзінных мясцін, урываюцца ветрам, снегам і дажджом вершы, паэтычныя аповеды. І яны — пра Давыд-Гарадок, пра гарадчукоў.

Кніга, якая ўражвае сваёй ілюстрацыйнасцю, — не проста энцыклапедыя жыцця палескага мястэчка, яна яшчэ і падарожжа ў адвечныя каштоўнасці жыцця. Адметна, што «Кветкавы край Беларусі» выдадзены ў Год малой радзімы і з'яўляецца цудоўным падарункам і берасцейцам, і чытачам усёй нашай краіны. Да ўсяго астатняга трэба заўважыць, што кніга выдатна, тэхналагічна выверана звярстана. Яе дызайн і макет апраўдана ўзводзяць «Кветкавы край Беларусі» ў катэгорыю намінантаў рэспубліканскага конкурсу «Мастацтва кнігі Беларусі», ды і конкурсу «Мастацтва кнігі СНД».

Варта заўважыць, што ў чарговы Год малой радзімы айчынныя кніжныя выдавецтвы ўступілі з мноствам цікавых падарункаў. Яны, грунтоўныя, энцыклапедычнага характару і публіцыстычнага выкладання, манаграфіі і нарысы, расказваюць пра вёскі Дражна Старадарожскага раёна, Азярычына Пухавіцкага раёна, пра многія цікавыя, адметныя сваёй біяграфіяй паселішчы ў іншых куточках літаральна ўсіх абласцей краіны. Выбудоўваецца тым самым сапраўдная вясковазнаўчая бібліятэка!

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

## Извещение о проведении 10 февраля 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| «Автомобильная стоянка» с инв. № в ЕГРНИ 610/С-50418 (**назначение:** сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства; **составные части и принадлежности:** площадка автомобильной стоянки (А), асфальтобетонное покрытие (а1), щебеночно-гравийное покрытие (а2), дорожки (а3), ограждение (Б), ограждение железобетонное (б1), ворота, калитка, ограждение металлическое на ж/б столбах (б2), ворота, калитка, ограждение металлическое (б3), блок-комната (Г2/бл)); |
| Сведения о земельном участке: площадь – 0,3802 га, кадастровый номер – 640400000007000074 |
| Местонахождение – Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пер. Инкубаторный, 10Г |
| **Начальная цена с учетом НДС – 34 432,16 бел. руб.** |
| Сумма задатка – 3400,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4–253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

